Беларускаму дзяржаўнаму ўніверсітэту – 95!

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

25 кастрычніка 2016 года, № 13–14 (2160–2161)

З днём нараджэння, БДУ!

Дарагія студэнты, магістранты, аспіранты, выкладчыкі і супрацоўнікі!

Ад сябе асабіста і ад імя рэктарата віншую ўсю ўніверсітэцкую супольнасць з 95-годдзем БДУ! Гэта вялікая дата з'яўляецца знакавай для ўсёй нашай краіны і беларускага грамадства.

Гісторыя БДУ пачынаецца з бурлівых 20-х гадоў мінулага стагоддзя і цесна пераплятаецца з лёсам беларускага народа. БДУ прайшоў вялікі шлях станаўлення і развіцця і справядліва лічыцца вядучым універсітэтам у Беларусі і сур'ёзным канкурэнтам у адукацыйным свеце.

Амаль стогадовы летапіс БДУ напоўнены аўтарытэтнымі імёнамі навукоўцаў, педагогаў і супрацоўнікаў, якія зрабілі істотны ўнёсак у развіццё і ўслаўленне сваёй альма-матар. Залатымі літарамі прапісана біяграфія першага рэктара БДУ Уладзіміра Пічэты, які стаяў ля вытокаў зараджэння на-

шага ўніверсітэта і ўсёй вышэйшай школы Беларусі. Ён заклаў трывалы падмурак універсітэцкіх традыцый, годным пераемнікам якіх стала не адно пакаленне выбітных педагогаў і студэнтаў.

БДУ сёння робіць неацэнны ўнёсак у перспектыўнае і інавацыйнае развіццё Беларусі. Ніводная дзяржаўна значная падзея не абыходзіцца без удзелу высокапрафесійных супрацоўнікаў БДУ. Мы своечасова рэагуем на запатрабаванні галін народнай гаспадаркі. Доказам таму служыць паспяховае выкананне праграмы па падрыхтоўцы спецыялістаў для працы на Беларускай АЭС.

Ужо аксіёма, што БДУ – гэта брэнд краіны, знак якасці ўсёй айчыннай сістэмы вышэйшай адукацыі. Прыемна ўсведамляць, што наша ВНУ з'яўляецца вядучай у фарміраванні інтэлектуальнага капіталу Беларусі. У ліку выпускнікоў вядомыя навукоўцы, акадэмікі, прафесары, лаўрэаты дзяржаўных прэмій СССР, БССР і Беларусі, менеджары вышэйшага звяна буйных кампаній. Са сцен БДУ выйшлі народныя паэты, заслужаныя дзеячы, прызёры Алімпійскіх гульняў. За амаль стогадовы перыяд тут падрыхтаваны дзясяткі тысяч спецыялістаў, якія заўсёды адрозніваліся высокім прафесіяналізмам, адданасцю сваёй справе і Беларусі!

БДУ падтрымлівае непарушны аўтарытэт беларускай вышэйшай адукацыі на постсавецкай і міжнароднай прасторы. БДУ – у тройцы найлепшых універсітэтаў краін СНД, Грузіі, Латвіі, Літвы і Эстоніі і ўваходзіць у лік 2 % найлепшых універсітэтаў свету! Па апошніх вынікаў брытанскага рэйтынгу QS наша ВНУ ўпершыню паднялася на 354-ю пазіцыю. Да стогадовага юбілею БДУ хацелася б бачыць яго ў ліку «залатой сотні»!

У гэты юбілейны год хачу пажадаць усяму калектыву БДУ здароўя, поспехаў, удачы, шанцавання і добрага настрою. Новых навуковых адкрыццяў і перамог, якія зробяць нашу альма-матар і Беларусь багацейшай і мацнейшай!

Са святам! З днём нараджэння, БДУ!

Рэктар акадэмік
Сяргей АБЛАМЕЙКА

БДУ ўпэўнена рухаец

Вядучая ВНУ краіны заўсёды прыцягвае да сябе ўвагу буйных СМІ, прычым не толькі айчынных, але і расійскіх. Аднак сёлета гэты інтарэс яшчэ больш падаграваўся ў сувязі з 95-годдзем БДУ, якое амаль супала з 60-годдзем яго паважанага рэктара акадэміка **Сяргея АБЛАМЕЙКІ**.
Да таго ж наш універсітэт сам зрабіў сабе два цудоўныя падарункі – вельмі паспяховая прыёмная кампанія і ўражвальны ўзлёт у аўтарытэтным сусветным рэйтынгу ўніверсітэтаў QS.
З гэтых нагод наш рэктар нямала шчыраваў у медыяпрасторы, падводзячы рахункі ў розных аспектах дзейнасці ўніверсітэта. Прапаноўваем самыя выразныя, на нашу думку, фрагменты з яго апошніх інтэрв'ю.

Рэктар БДУ Сяргей Абламейка разам з лідарамі моладзевых арганізацый і першакурснікамі на Дні ведаў. 1 верасня 2016 г.

– Сяргей Уладзіміравіч, універсітэту спаўняецца 95 гадоў. Якія найважнейшыя яго дасягненні ў апошнія пяць гадоў Вы можаце адзначыць?

Юбілейная дата БДУ з'яўляецца знакавай не толькі для нашага ўніверсітэта, але і для ўсёй Беларусі ў цэлым. Сёння наша ВНУ стала магутным навукова-адукацыйным цэнтрам у нашай краіне і за яе межамі. Я пра гэта заяўляю з поўнай адказнасцю, бо знаёмы са шматлікімі ўніверсітэтамі свету. І, паверце, ёсць з чым параўноўваць і чым ганарыцца.

Значным нашым поспехам за апошнія пяць гадоў лічу выхад БДУ на перадавыя радкі вядомых сусветных адукацыйных рэйтынгаў. Наша ВНУ стала адным з аўтарытэтных і інтэлектуальных мегаполісаў на міжнароднай адукацыйнай арэне. БДУ – лідар у сістэме вышэйшай адукацыі Беларусі, уваходзіць у тройку найлепшых універсітэтаў краін СНД, Грузіі, Латвіі, Літвы і Эстоніі і ўваходзіць у 2 % найлепшых універсітэтаў свету! Па апошніх выніках брытанскага рэйтынгу QS Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт займае 354 месца, а па выніках Webometrics – мы на 589 месцы! Да стогадовага юбілею БДУ хацелася б бачыць яго ў ліку «залатой сотні»!

Натуральна, вялізная заслуга ў такім прарыве ў карпатлівай і мэтанакіраванай працы шматтысячнага калектыву супрацоўнікаў і студэнтаў БДУ. Тут важна не толькі аналізаваць патрабаванні рэйтынгаў, вызначаць асноўныя прыярытэты далейшага прасоўвання, але і ўдасканальваць навуковую і адукацыйную працу. Немагчыма прэзентаваць сябе ў інтэрнэт-прасторы без канкурэнтнай навукова-адукацыйнай прадукцыі. Толькі высілкі кожнага працаўніка ўніверсітэцкай супольнасці здольныя паспяхова развіваць БДУ і дасягаць часам і немагчымага.

– Што трэба зрабіць, каб наш самы буйны ўніверсітэт у краіне трапіў у сотню найлепшых універсітэтаў свету?

– Гэта досыць няпросты шлях, і «на раз-два» не атрымаецца. Зразумейце адно: вядомыя сістэмы ранжыравання разлічаны на англамоўныя ўніверсітэты. Пры складанні рэйтынгу ўлічваецца ўзровень навуковай дзейнасці, колькасць публікацый у англамоўных часопісах. Безумоўна, уплывае і фінансаванне. Не трэба быць вялікім аналітыкам, каб адзначыць той факт, што бюджэт БДУ значна меншы, чым у аналагічных еўрапейскіх ці амерыканскіх вядучых навучальных устаноў. А калі сродкаў у ВНУ дастаткова, то абсталяванне і арганізацыя навучальнага працэсу будуць на парадак вышэйшымі. Напрыклад, можна нават запрасіць чытаць лекцыі нобелеўскіх лаўрэатаў.

Карацей кажучы, «далейшае прасоўванне да 100 найлепшых універсітэтаў свету немагчымае без сур'ёзных фінансавых укладанняў».

– …Ці ўсё ж такі ёсць куды «прыбавіць ход»?

– Шкадую, што БДУ так і не атрымаў асаблівага статусу нацыянальнага ўніверсітэта. Было прыкладзена шмат намаганняў, і мелася дастаткова рэальна пераканаўчых фактаў. Але на жаль… Мы працягваем умацоўваць пазіцыі беларускай адукацыі і навукі на міжнароднай арэне, задавольваем кадравыя і навуковыя запыты высокатэхналагічнага сектара беларускай эканомікі. І з улікам таго, што БДУ ўключаны сёння ў глабальную канкурэнцыю ў сістэме адукацыі, асаблівы статус істотна паспрыяў бы ў нашым намеры стаць на адзін узровень з прызнанымі флагманамі навукі і адукацыі.

Адукацыя: змены ў змесце, кантроль і кіраванне

З 2011 па 2016 гады мы адкрылі 18 новых спецыяльнасцяў і 6 напрамкаў спецыяльнасцяў на першай ступені атрымання вышэйшай адукацыі. За гэты ж перыяд ахвотным вучыцца ў магістратуры прапанавана 29 новых спецыяльнасцяў. Перад працэсам запуску новых вучэбных праграм мы карпатліва даследуем рынак, удакладняем у адпаведных ведамствах запатрабаванасць будучых спецыялістаў праз пяць гадоў. Ключавым аргументам на карысць адкрыцця новых спецыяльнасцяў з'яўляецца іх непасрэдная сувязь з сучаснымі перадавымі напрамкамі развіцця навукі. Таму мы ўжо рыхтуем спецыялістаў для разнастайных перадавых галін, як мікрабіялогія, біяхімія, геаінфармацыйныя сістэмы, хімія лекавых злучэнняў, нанатэхналогія, ядзерная фізіка і многія іншыя.

Сістэма менеджменту якасці была ўведзена ў БДУ ў 2010 годзе. Гэта новаўвядзенне рэгламентуе ўсе бакі адукацыйнага, навуковага і выхаваўчага працэсаў структурных падраздзяленняў БДУ. У гэтым годзе Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт прайшоў рэсертыфікацыйны аўдыт і пацвердзіў адпаведнасць сістэмы менеджменту якасці міжнародным стандартам серыі ІСО-9000 у нацыянальнай сістэме сертыфікацыі і нямецкай сістэме сертыфікацыі.

Якасць адукацыі патрабуе змены ў змесце навучання. З 2013 года набылі моц адукацыйныя стандарты трэцяга пакалення і адпаведныя ім новыя вучэбныя планы. Сярод адметных асаблівасцяў новых стандартаў – скарачэнне тэрмінаў атрымання вышэйшай адукацыі на першай ступені практычна па ўсіх гуманітарных і эканамічных, большасці прыродазнаўчых спецыяльнасцяў; практыкаарыентаванае навучанне.

У БДУ цяпер падтрымліваецца праца дзвюх сістэм кіравання навучаннем: сеткавая адукацыйная платформа e-university (даступная па адрасе http://euniversity.bsu.by) і сістэма анлайн-навучання Moodle (размяшчаецца па адрасе http://dl.bsu.by). На абедзвюх платформах назапашаны значны аб'ём вучэбнага матэрыялу, элементаў электронных вучэбна-метадычных комплексаў і гатовых паўнавартасных ВМК. У Інстытуце бізнесу і менеджменту тэхналогій БДУ маецца значны досвед укаранення тэхналогій электроннай адукацыі ў вучэбны працэс. Практычна па кожнай дысцыпліне распрацаваны суправаджальныя вучэбныя курсы на аснове сістэмы кіравання навучаннем eLearning Server, маецца адукацыйны партал, даступны па адрасе http://cdesbmt.by. Праводзяцца відэаканферэнцыі і вэбінары. Істотны вопыт у стварэнні электронных адукацыйных рэсурсаў, у тым ліку і сумесных з замежнымі ўніверсітэтамі, назапашаны на хімічным факультэце БДУ.

Навука: БДУ дынамічна развіваецца і ўдзельнічае ў буйных міжнародных праектах

Развіццё ўніверсітэта, ды і цэлай краіны, немагчымае без навуковай дзейнасці супрацоўнікаў БДУ. Стан універсітэцкай навукі, распрацоўкі нашых навукова-даследчых устаноў з'яўляюцца гонарам і радасцю рэктара, чым ён ахвотна дзеліцца з журналістамі.

«БДУ перажыў цяжкія 1990-я і стаў дынамічна развівацца. За апошнія 10–15 гадоў мы прыбавілі,

На працягу апошніх трох гадоў адзначаецца павелічэнне ліку прынятых абітурыентаў. Сёлета на ўсе формы атрымання вышэйшай адукацыі залічана звыш 5500 абітурыентаў. З усіх прынятых на дзённую бюджэтную форму навучання больш за палову залічаных маюць сумарны бал вышэй за 300. Мэтанакіраваная праца дазволіла забяспечыць высокую якасць падрыхтоўкі спецыялістаў па ядзерных спецыяльнасцях, якія сталі аднымі з найбольш запатрабаваных на фізічным і хімічным факультэтах.

ца ў сусветную эліту

і БДУ ніколі не быў такі моцны. Цяпер мы можам сказаць не толькі тое, што навукоўцы і выкладчыкі БДУ публікуюць штогод каля 5000 артыкулаў і каля 5000 тэзісаў дакладаў на канферэнцыях, але і тое, што большая частка артыкулаў публікуецца ў міжнародных часопісах і працах канферэнцый. Так званы «індэкс Хірша» (рэйтынг цытаванасці) у многіх нашых навукоўцаў вельмі высокі. Так, напрыклад, у прафесара Міхаіла Арцем'ева – 29. Гэта нават вышэй, чым у шэрагу нобелеўскіх лаўрэатаў».

У склад Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ўваходзяць шэсць навукова-даследчых устаноў. Найбольш буйныя з іх – гэта Інстытут прыкладных фізічных праблем імя А. Н. Сеўчанкі, НДІ фізікахімічных праблем, НДІ ядзерных праблем. У 2016 г. БДУ ўдзельнічае ў 40 саюзных, дзяржаўных, рэспубліканскіх, навукова-тэхнічных, галіновых навуковых праграмах. Навукоўцы БДУ прымаюць актыўны ўдзел у буйных міжнародных праектах сумесна з калегамі з Расіі, Германіі, Швейцарыі, Францыі, ЗША, Польшчы. Напрыклад, мы плённа супрацоўнічаем з Аб'яднаным інстытутам ядзерных даследаванняў (Расія, Дубна), а ў 2015 г. на базе лабараторыі нанаэлектрамагнетызму НДІ ЯП наша ВНУ сумесна з Універсітэтам навукі і тэхналогій Харбіна стварыла навуковую і адукацыйную лабараторыю па нанавугляродных матэрыялах і дадатках.

Цэнтры калектыўнага карыстання

Для больш рацыянальнага выкарыстання ўнікальнага і каштоўнага навуковага абсталявання ў БДУ існуюць чатыры цэнтры калектыўнага карыстання. Яны аснашчаны ўнікальнымі прыборамі і абсталяваннем для правядзення навуковых даследаванняў і падрыхтоўкі спецыялістаў найвышэйшай кваліфікацыі і адпавядаюць сучаснаму ўзроўню навуковых даследаванняў, прыярытэтным кірункам навукова-тэхнічнай дзейнасці і навуковым кірункам БДУ.

Да чытання лекцый прыцягваюцца найбуйнейшыя навукоўцы Нацыянальнай акадэміі навук РБ, Расійскай акадэміі навук, вядучыя спецыялісты кампаній, замежных вышэйшых навучальных устаноў.

Распрацоўкі

Сёння ў нас ніводная значная дзяржаўная падзея не абыходзіцца без удзелу высокапрафесійных супрацоўнікаў з БДУ. Мы хутка і своечасова рэагуем на патрэбы галін народнай гаспадаркі. Доказам таму служыць паспяховае выкананне праграмы па падрыхтоўцы спецыялістаў для працы на Астравецкай АЭС, якая будуецца ў Беларусі (вучэбна-навуковы цэнтр па падрыхтоўцы кадраў для АЭС створаны на базе фізічнага і хімічнага факультэтаў БДУ, НДІ ЯП БДУ, Аб'яднанага інстытута энергетычных і ядзерных даследаванняў НАН Беларусі), укараненне ў прамысловую эксплуатацыю Адзінай інфармацыйнай сістэмы дзяржаўнай статыстыкі Беларусі. Гэта інфармацыйная сістэма дазваляе збіраць статыстычную справаздачнасць у электронным фармаце больш чым ад 80 тысяч рэспандэнтаў.

У цэлым, толькі ў мінулым годзе 138 навуковых распрацовак Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ўкаранёна ў народную гаспадарку нашай краіны для забеспячэння патрэбаў у галіне будаўніцтва, медыцыны, сельскай гаспадаркі, харчовай і перапрацоўчай прамысловасці. Але не менш важная для БДУ мадэрнізацыя вучэбнага працэсу. Толькі за апошні час каля 300 тэхналогій апрабавана выкладчыкамі і студэнтамі ўніверсітэта.

Нягледзячы на пэўныя крызісныя з'явы ў сусветнай эканоміцы, установы комплексу БДУ за апошнія пяць гадоў пастаўляюць штогод на экспарт навукова-тэхнічную прадукцыю ў аб'ёмах ад 1,6 да 2,3 млн дол. ЗША. За гэтыя гады прадукцыя была пастаўлена ў 39 краін, з іх у 31 краіну далёкага замежжа – ЗША, Кітай, Вялікабрытанію, ФРГ, Францыю, Ізраіль і інш.

Космас

БДУ яшчэ з савецкага часу актыўна ўдзельнічаў у касмічных праграмах і эксперыментах. Наша відэаспектральная праграма, створаная ў НДІ прыкладных фізічных праблем імя А. Н. Сеўчанкі, нядаўна пастаўлена на Міжнародную касмічную станцыю, у расійскі сегмент. Папярэдняя версія таксама была ад БДУ. Мы ў чэрвені 2013 г. праводзілі сеанс сувязі з касманаўтамі на МКС, яны распавядалі, як з нашай апаратурай працуюць.

– ***Студэнцкі касмічны спадарожнік яшчэ чакае сваёй чаргі?***

– Мы закупілі платформу, пішам праграмнае забеспячэнне, рыхтуемся да зборкі. МДУ нядаўна запусціў свой спадарожнік «Ламаносаў». Мы сабе пакуль што такі не можам дазволіць. У 2013 г. у БДУ правялі пад эгідай ААН першую ў гісторыі Беларусі канферэнцыю па выкарыстанні касмічных тэхналогій. З дакладамі выступілі больш за 100 навукоўцаў з 25 краін, працавала 8 секцый – гэта таксама знак прызнання Беларусі. Якраз напярэдадні канферэнцыі Беларусь стала паўнапраўным членам Камітэта ААН па даследаванні космасу. Справа фінансава затратная, але дзяржава гэта моцна падтрымлівае.

Замежнае партнёрства

Падрыхтоўка замежных студэнтаў – агульнапрызнаная і распаўсюджаная міжнародная практыка. Безумоўна, экспарт адукацыйных паслуг павышае прэстыж нацыянальнай сістэмы адукацыі і забяспечвае прыток замежнай валюты ў эканоміку краіны

На сёння ў БДУ вучацца больш за 2,3 тысячы замежных грамадзян з 50 краін. Калі разглядаць рэйтынг папулярнасці нашай ВНУ сярод студэнтаў-замежнікаў, то ў пяцёрку лідараў увайшлі Туркеністан, Кітай, Расія, Казахстан і Азербайджан.

У 2015 г. было заключана 38 новых і абноўлена 7 дзейных дамоў пра супрацоўніцтва. За апошнія гады БДУ ўсталяваў кантакты з універсітэтамі Сербіі, Новай Зеландыі, Грузіі.

Наяўнасць замежных студэнтаў забяспечвае падрыхтаванасць выпускнікоў да працы ва ўмовах глабальнай эканомікі і ператварэнне ўніверсітэта ў міжнародны навукова-адукацыйны комплекс.

БДУ з'яўляецца адным з арганізатараў Еўразійскай асацыяцыі ўніверсітэтаў, выступае ўніверсітэтам-каардынатарам ад Рэспублікі Беларусь ва ўніверсітэцкай сетцы Цэнтральнаеўрапейскай ініцыятывы, удзельнічае ў працы Беларускай асацыяцыі спрыяння ААН, Еўрапейскай камісіі і Савета Еўропы і інш.

Ва ўніверсітэце дзейнічае каля 400 дамоў пра супрацоўніцтва з адукацыйнымі і навуковымі ўстановамі, міжнароднымі кампаніямі і арганізацыямі з 60 краін. БДУ ўваходзіць у склад кансорцыума Сеткавага ўніверсітэта СНД.

Універсітэтам рэалізуецца звыш 60 міжнародных навуковых і адукацыйных праектаў, у тым ліку ў межах VII Рамачнай праграмы ЕС, МНТЦ, «Тэмпус», «Юнеска», «Эразмус Мундус», CIMO, ДААД, НАТА, ААН, ПРААН-ГЭФ, «Вісбі» і інш.

Міжнародныя абмены

Найбольш цеснае ўзаемадзеянне ажыццяўляецца з Расійскай Федэрацыяй і краінамі-членамі СНД, а таксама з дзяржавамі Заходняй і Усходняй Еўропы. Рэалізуюцца праграмы сумеснай падрыхтоўкі спецыялістаў і кадраў вышэйшай кваліфікацыі з універсітэтамі-партнёрамі з Кітая, В'етнама і Германіі.

Уключанае навучанне ў БДУ ў межах міжнародных дамоў праходзяць студэнты Рурскага ўніверсітэта (г. Бохум, Германія), Універсітэта імя Ф. Шылера (г. Ена, Германія), Лейпцыгскага ўніверсітэта (Германія), Універсітэта М. Кюры-Складоўскай (г. Люблін, Польшча), Лодзінскага ўніверсітэта (Польшча), Карлава ўніверсітэта (г. Прага, Чэхія), Кітайскага ўніверсітэта міжнародных адносін (г. Пекін, КНР), Белградскага ўніверсітэта (Сербія), Універсітэта Чонг Бук (г. Чэнджоу, Карэя) і іншых.

У той жа час нашы студэнты маюць магчымасць прайсці стажыроўку ў ВНУ-партнёрах БДУ. Партнёрскія сувязі з універсітэтамі Блізкага Усходу, Паўночнай Афрыкі і азіяцкага рэгіёну дазваляюць развіваць акадэмічныя абмены студэнтам-усходазнаўцам, якія вывучаюць арабскую, кітайскую і японскую мовы (Кітайскі ўніверсітэт міжнародных адносін (г. Пекін, КНР), Універсітэт Васеда (г. Токіа, Японія), Каірскі ўніверсітэт (г. Каір, Егіпет).

Інфарматызацыя

– ***Сяргей Уладзіміравіч, у 2013 годзе ў БДУ была распрацавана канцэпцыя інфарматызацыі з разлікам на пяць найбліжэйшых гадоў. Наколькі далёка ўдалося прасунуцца ў яе рэалізацыі?***

– Пашырэнне прадстаўніцтва БДУ ў інтэрнэце – якраз адна з задач, прапісаных у нашай канцэпцыі, і мы з ёй, мяркую, паспяхова спраўляемся. На сёння ў БДУ створана сучасная тэлекамунікацыйная інфраструктура. Агульная працягласць оптавалаконных магістраляў дасягае 50 кіламетраў!

Пашыраны прапускныя здольнасці знешніх каналаў, прадугледжаны дадатковыя метады сеткавай бяспекі з улікам масавага падключэння да сеткі мабільных прылад студэнтаў і супрацоўнікаў.

Адзін са стратэгічных напрамкаў – развіццё «воблачных тэхналогій»: прымяненне апошніх гарантуе мабільнасць і актуальнасць адукацыйных рэсурсаў, зніжэнне выдаткаў на інфарматызацыю і магчымасць гарантаваць высокі ўзровень бяспекі інфармацыі. Ва ўніверсітэце створаны і развіваецца цэнтр апрацоўкі дадзеных на платформе IBM Pure Flex System. Ён будзе інтэграваны з суперкамп'ютарным кластарам «СКІФ», што дазволіць стварыць віртуальныя рабочыя месцы, у тым ліку арыентаваныя на выкананне высокапрадукцыйных вылічэнняў. «Воблачныя тэхналогіі» дазволяць студэнтам працаваць з праграмным забеспячэннем віртуальнай лабараторыі з любых камп'ютараў як у карпарацыйнай сетцы БДУ, так і дома, праз інтэрнэт, не ўсталёўваючы на гэтыя камп'ютары спецыяльнае праграмнае забеспячэнне.

Стварэнне адукацыйнага мультымедыйнага кантэнту (відэазапісаў лекцый, лабараторных дэманстрацый, запісаў відэаканферэнцый, навучальных відэароліка ў і г. д.) – прыярытэтная задача інфарматызацыі ў БДУ. Для доступу да мультымедыйнага кантэнту ў найбліжэйшы час павінна быць укаранёна сістэма «відэа па запыце».

Паставіўшы задачу максімальнага ўключэння ў адукацыйны працэс асабістых персанальных камп'ютараў і камп'ютарных прылад, універсітэт перагледзеў тыпавыя канфігурацыі камп'ютарных класаў, якія функцыянуюць у «воблачнай сістэме». Мы лічым, што колькасць камп'ютараў у большасці класаў можа быць скарочана да 40-50 % ад колькасці студэнтаў. Астатнія ж працоўныя месцы будуць абсталёўвацца зручнымі (праваднымі або бесправаднымі) сродкамі доступу ў сетку БДУ для падключэння асабістых мабільных прылад нашых студэнтаў.

...Сайт універсітэта – www.bsu.by – самы буйны ўніверсітэцкі інфармацыйны рэсурс у нашай краіне, агульная колькасць наведнікаў сайта складае больш за 100 000 у месяц, а агульная колькасць старонак сайта перавышае 20 000. У гэтым годзе сайт БДУ атрымаў 1 месца ў намінацыі «Адукацыя і навука» інтэрнэт-прэміі TIBO. Летась такую ж узнагароду атрымаў сайт «Абітурыент БДУ», створаны спецыяльна для абітурыентаў і іх бацькоў.

– ***У чым Вы бачыце місію Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і сваю асабістую місію як кіраўніка?***

– Галоўнай задачай БДУ, як і ўсіх у прынцыпе ўстаноў вышэйшай адукацыі, з'яўляецца падрыхтоўка высококваліфікаваных кадраў для задавальнення інтэлектуальных, навуковых, вытворчых, культурных, сацыяльных запытаў у першую чаргу сваёй краіны. Мы імкнёмся, каб выпушчаныя намі спецыялісты былі канкурэнтаздольнымі на сучасным рынку працы і адпавядалі ўсім патрабаванням інавацыйнай эканомікі. Наш выпускнік, апрача валодання прафесійнымі ведамі, паказвае высокі ўзровень валодання інфармацыйнымі тэхналогіямі, замежнымі мовамі. Ён гатовы да пастаяннай самаадукацыі, падтрымліваючы актуальны сёння лозунг паспяховай кар'еры «Адукацыя праз усё жыццё». Не варта забываць і пра актыўную навуковую і вытворчую дзейнасць ВНУ.

Што ж тычыцца маіх прыярытэтаў у кіраванні БДУ, то арыенцір бяру ў першую чаргу на якасць. Прэстыж Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў Беларусі і за яе межамі ў мяне на першым месцы. Адчуваю вялізную адказнасць перад тым, каб дыплом БДУ быў гарантам паспяховага фарміравання чалавечага капіталу і развіцця грамадства, а навуковыя даследаванні БДУ характарызаваліся высокім узроўнем выканання. Таксама вядзецца вялізная праца ў ВНУ па папулярызацыі якасці адукацыі і навукі БДУ на сусветнай адукацыйнай прасторы, бо пераканаць, што адукацыя і навука не павінны мець нацыянальных межаў.

Лічбы

Як буйны вучэбна-навукова-вытворчы комплекс, БДУ ўключае **16** факультэтаў і **7** адукацыйных інстытутаў, ліцэй і юрыдычны каледж, а таксама навукова-даследчыя ўстановы, вытворчыя прадпрыемствы.

За год тут праходзіць навучанне амаль **50** тыс. чалавек і працуе каля **9** тыс. супрацоўнікаў. З іх **2895** штатных выкладчыкаў, з якіх **7** акадэмікаў, **6** членаў-карэспандэнтаў Акадэміі навук Беларусі, **257** дактароў навук і **1204** маюць ступень кандыдата навук.

На балансе ўніверсітэта больш за **100** збудаванняў.

Падрыхтоўка вядзецца па **83** спецыяльнасцях, **81** напрамку спецыяльнасці і каля **280** спецыялізацыях першай ступені вышэйшай адукацыі, па **81** спецыяльнасці другой ступені.

Падрыхтавалі
Сяргей ШАФАЛОВІЧ
і Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ

У артыкуле выкарыстаны наступныя матэрыялы СМІ:

1. БГУ в стране и мире // Беларуская думка. 2016. № 10.
2. Вместо послесловия // Сергей Владимирович Абламейко: диалоги о главном. – Минск: БГУ, 2016.
3. БГУ – флагман высшего образования Беларуси и международный бренд // Партал «Бизнес России». 2016. 5 верасня.
4. Даніна модзе ці будучыні? // Звязда, 2016, 30 красавіка.
5. Ікар свайго часу // Звязда. 2015. 29 мая.
6. В движении к престижу // Поиск. 2015. 22 мая.
7. Полет на гнездом БеКаССА // Союзное государство. 2015. Сакавік.
8. Погоду вузу делает наука // Рэспубліка. 2015. 10 верасня.

Першы прарэктар акадэмік Алег Івашкевіч

Прарэктар па вучэбнай рабоце Аляксей Толсцік

Прарэктар па вучэбнай рабоце Сяргей Ходзін

Прарэктар па навуковай рабоце Васіль Сафонаў

Прарэктар па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях Уладзімір Суораў

Прарэктар па гаспадарчай рабоце Уладзімір Рагавіцкі

Слова прарэктарам

Такі велізарны комплекс, як БДУ, развіваецца па многіх напрамках. Кожны з іх курыруе прарэктар. Напярэдадні 95-годдзя альма-матар мы звярнуліся да першых асоб універсітэта з трыма пытаннямі:

1. *Якія б Вы адзначылі важныя моманты ў жыцці БДУ за час сваёй дзейнасці?*

2. *Што Вы лічыце найлепшым падарункам альма-матар да яе свята?*

3. *Якім Вы бачыце ўніверсітэт праз 5 гадоў, калі наша ВНУ будзе адзначаць эпахальны 100-гадовы юбілей?*

Алег ІВАШКЕВІЧ:

1. БДУ – велізарны жывы арганізм, які дынамічна развіваецца, і падзей у яго жыцці адбываецца вялікае мноства. Перш за ўсё гэта ўпэўненае прасоўванне БДУ ўгару ва ўсіх рэйтынгах у сусветнай навукова-адукацыйнай прасторы. Такі рух немагчымы без сістэмнай працы ўсіх навучальных, навуковых падраздзяленняў і службаў універсітэта і сведчыць пра тое, што БДУ мае магутны патэнцыял для развіцця. Сярод іншых важных падзей я б адзначыў стварэнне на базе ўніверсітэцкага прадпрыемства «Унітэхпрам БДУ» суперсучаснай вытворчасці супрацьпухлінных і кардыятропных прэпаратаў, распрацаваных у НДІ фізіка-хімічных праблем у адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі GMP, а таксама аб'яднанне НДІ ядзерных праблем БДУ з Нацыянальным цэнтрам фізікі часціц і высокіх энергій БДУ, што прывяло да стварэння моцнага інстытута, у якім цяпер працуюць самыя рэйтынгавыя навукоўцы ў галіне фізікі ў нашай краіне. Хацелася б таксама адзначыць паспяховую працу прадпрыемства «Унікаштмет БДУ», якое робіць значны ўнёсак у папаўненне золатавалютных рэзерваў нашай краіны.

2. Захаванне глыбокіх традыцый і пераемнасці ў развіцці ўніверсітэта. Узмацненне ролі БДУ ў Беларусі, які аказвае пазітыўны ўплыў на ўсе бакі жыццядзейнасці дзяржавы. Развіццё адукацыі на аснове міждысцыплінарных даследаванняў і кансалідацыя навукоўцаў БДУ ў гэтай сферы.

3. Я перакананы, што, нягледзячы на ўсе выклікі цяперашняга часу, да свайго стогадовага юбілею БДУ прыйдзе яшчэ мацнейшым, згуртаваным, упэўненым у сваёй будучыні, які паважаюць у свеце. Для гэтага ёсць усё: прафесійны прафесарска-выкладчыцкі калектыў, навукова-даследчыя ўстановы з вядомымі ва ўсім свеце навукоўцамі, найлепшыя ў краіне студэнты і жаданне працаваць на карысць дзяржавы. Са святам!

Аляксей ТОЛСЦІК:

1. Галоўнае дасягненне – фарміраванне адзінага навучальна-навукова-вытворчага комплексу БДУ, які па сваёй сутнасці ўвасобіў ідэі інавацыйнага развіцця: ад падрыхтоўкі кваліфікаваных спецыялістаў да навуковых даследаванняў і да выпуску высокатэхналагічнай прадукцыі.

Цяпер БДУ ўдзельнічае ў 10 розных міжнародных рэйтынгах і трапляе ў пяцёрку найлепшых універсітэтаў краін СНД, а па расійскім рэйтынгу «Інтэрфакс» БДУ заняў другое месца пасля МДУ. Важным дасягненнем стала стварэнне Электроннай бібліятэкі БДУ, якая ўвайшла ў сотню найлепшых універсітэцкіх электронных бібліятэк свету.

На працягу трох гадоў павялічваецца лік прынятых абітурыентаў. Сёлета на ўсе формы атрымання вышэйшай адукацыі залічана звыш 5500 абітурыентаў.

2. Найлепшыя падарункі ўніверсітэту – гэта дасягненні саміх супрацоўнікаў, студэнтаў і аспірантаў. Усё гэта стварае імідж універсітэта, робіць яго вядомым у сусветнай адукацыйнай і навуковай супольнасці. БДУ імкнецца падтрымліваць акадэмічную мабільнасць. Штогод за мяжу выязджае каля тысячы выкладчыкаў і гэтулькі ж студэнтаў па міжнародных абменных праграмах для ўдзелу ў канферэнцыях. А калі за мяжой зроблены добры даклад, гэта яшчэ крок угару для ВНУ! Парадавалі поспехі нашых студэнтаў і аспірантаў на шматлікіх алімпіядах і конкурсах.

3. У сваё 100-годдзе ўніверсітэт увойдзе як адна з вядучых ВНУ ўсёй еўрапейскай прасторы. Далейшае развіццё атрымаюць міжнародныя кантакты, акадэмічныя абмены, студэнцкая мабільнасць. Паўнавартасна запрацуе магістратура па перспектыўных напрамках пад кіраўніцтвам вядучых навукоўцаў, што дазволіць у разы павялічыць колькасць магістрантаў.

Будуць адкрыты новыя міждысцыплінарныя спецыяльнасці, уведзены электронны дакументазварот і выключана залішняя справаздачнасць, забяспечана высокая матывацыя студэнтаў дзякуючы цеснаму супрацоўніцтву ўніверсітэта з працадаўцамі, будзе цалкам вырашана праблема забеспячэння студэнтаў інтэрнатам і, вядома, завершаны рамонт галоўнага корпуса. Візітная картка БДУ – якасць адукацыі і навуковых даследаванняў. Менавіта яднанне адукацыі, навукі і вытворчасці дазваляе забяспечыць якасную падрыхтоўку спецыялістаў па самых перадавых кірунках, якія вызначаюць развіццё сучаснага інавацыйнага грамадства.

Сяргей ХОДЗІН:

1. На пасадзе прарэктара працую нядаўна, але ўжо магу адзначыць больш заўважную на гэтым узроўні згуртаванасць і накіраванасць дзеянняў калектыву БДУ. Амаль кожны тыдзень на факультэтах адбываюцца канферэнцыі, круглыя сталы, студэнцкія мерапрыемствы, якія закранаюць найважнейшыя аспекты навуковага развіцця, выкладання і выхаваўчай працы ў пэўнай сферы.

2. Сапраўды, кожны з нас – частка БДУ. Толькі разам мы складаем тую магутную сілу, якая адчуваецца ва ўсіх кірунках дзейнасці ўніверсітэта. Таму жадаю здароў'я, дабрабыту і творчага настрою і як мага даўжэй заставацца разам з БДУ.

3. Бачу ўніверсітэт як унікальную эксперыментальную пляцоўку развіцця інавацыйных падыходаў і тэхналогій у галіне адукацыі і навукі з неабходнымі для рэалізацыі гэтай ідэі паўнамоцтвамі і магчымасцямі. Перакананы, што БДУ захавае свой выдатны калектыў аднадумцаў, пашырыць свой уплыў, узвысіць свае пазіцыі па ўсіх кірунках дзейнасці.

Васіль САФОНАЎ:

1. У навуковай і інавацыйнай дзейнасці хачу адзначыць:

– прысуджэнне А. А. Івашкевічу, А. І. Лесніковічу, М. В. Арцем'еву Дзяржаўнай прэміі РБ 2012 г. за цыкл навуковых прац па хіміі;

– БДУ ў 2011 годзе ўпершыню акрэдытаваны ў якасці навуковай арганізацыі;

– удзел навукоўцаў НДІ ЯП у маштабным міжнародным праекце, вынікам якога стала адкрыццё базона Хігса ў 2012 г.;

– прысуджэнне супрацоўнікам БДУ розных міжнародных прэмій і ўзнагарод за дасягненні ў навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці (залаты медаль Сусветнай арганізацыі інтэлектуальнай уласнасці, Scopus Award Belarus і інш.);

– стварэнне сумесных інавацыйных цэнтраў з Кітаем і В'етнамам.

2. Найлепшымі падарункамі для ўніверсітэта, на маю думку, з'яўляюцца:

– адкрыццё вытворчасці лекавых субстанцый і прэпаратаў на РУП «Унітэхпрам БДУ» ў адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі якасці GMP;

– стварэнне ўніверсітэцкага нанаспадарожніка і наземнага комплексу кіравання ім у мэтах высакаякаснай падрыхтоўкі кадраў для Беларускай касмічнай сістэмы дыстанцыйнага зандавання Зямлі.

3. Да 100-годдзя БДУ павінен да лідарства ў навуцы і адукацыі дадаць вядучыя пазіцыі ў інавацыйнай дзейнасці, здабыць развітую інфраструктуру. У комплексе БДУ будзе сфарміравана інавацыйнае асяроддзе з эфектыўным бізнес-інкубатарам, універсітэцкім тэхнапаркам, новымі вытворчасцямі і прамысловымі кірункамі, актыўным ростам студэнцкага прадпрымальніцтва. Праз 5 гадоў вядучая ўстанова вышэйшай адукацыі краіны будзе па-ранейшаму ўпэўнена займаць высокія пазіцыі ў сусветных рэйтынгах універсітэтаў, удзельнічаць у выкананні маштабных міжнародных праектаў па прарыўных навуковых кірунках.

Уладзімір СУВОРАЎ:

1. Лічу найважнейшым дасягненнем вытворчыя і чалавечыя адносіны, якія склаліся паміж прадстаўнікамі ўсіх структур, задзейнічанымі ў навучальна-выхаваўчым працэсе.

У першую чаргу гэта, вядома, факультэты, УВРМ, студэнцкі гарадок, упраўленне па справах культуры, псіхалагічная служба, органы студэнцкага самакіравання. Іх узаемадзеянне на прынцыпах павагі і падтрымкі, адказнасці і даверу фарміруюць уяўленне пра БДУ як пра адзіную карпарацыю.

2. Калі мяне пытаюць, што табе падарыць, я адказваю: НІЧОГА, у мяне ўсё ёсць. Проста прыходзьце ў госці! Мне здаецца, што ў гэтым сэнсе ў БДУ калі не ўсё, то ГАЛОЎНАЕ ёсць: высокапрафесійныя педагогі, выбітныя навукоўцы, найлепшыя студэнты... Проста прыходзьце ў госці!

3. Упэўнены, што да гэтага часу БДУ яшчэ больш умацуе свае пазіцыі, бо зацята працаваць стала часткай культуры ўніверсітэта.

Уладзімір РАГАВІЦКІ:

1. а) Паляпшэнне ўмоў правядзення навучальнага працэсу за кошт:

– капітальнага рамонту з мадэрнізацыяй навучальнага корпуса з блокам дапаможных памяшканняў па вул. Маскоўская, 5;

– поўнай замены ўсіх аконных блокаў і ўцяплення фасадаў навучальнага корпуса па вул. Ленінградская, 14;

– увядзення ў эксплуатацыю будынка ФМА па вул. Ленінградская, 20;

– мадэрнізацыі гарачага водазабеспячэння, а таксама замены вонкавых сетак электразабеспячэння навучальна-геаграфічнай станцыі «Заходняя Бярэзіна».

б) Павышэнне бяспекі арганізацыі навучальнага працэсу з прывядзеннем яго да сучасных нормаў.

в) Паляпшэнне ўмоў пражывання навучэнцаў у інтэрнатах і арганізацыі харчавання ў студэнцкіх сталовых.

2. Найлепшым падарункам на 95-годдзе БДУ лічу ўвод у эксплуатацыю новага будынка факультэта міжнародных адносін, а таксама двух інтэрнатаў у Студэнцкай вёсцы.

3. Праз 5 гадоў спадзяюся на поўнае ўкараненне сучасных адукацыйных інфармацыйных і тэлекамунікацыйных тэхналогій, накіраваных на павышэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў на ўсіх узроўнях, працяг умацавання і ўдасканалення матэрыяльна-тэхнічнай базы ўніверсітэта.

Беларускі ўніверсітэт: першыя крокі на шляху Навукі і Ведаў

№ 186.

БИЛЕТ

для входа на торжественный акт открытия Белорусского Государственного Университета 30 октября, 1921-го года в 1 ч. 30 м. дня в ЗДАНИИ УН-ТА.

(Магазинная ул. д. быш. Реального училища Хайкина).

У летапісе нашай alma mater зафіксавана дата ўрачыстага сходу, які канстатаваў, што першасныя дзеянні па арганізацыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта прынеслі плён. З нагоды гадавіны вызвалення Мінска ад польскай акупацыі 11 ліпеня 1921 г. у будынку клуба імя Карла Маркса (Мінскі гарадскі тэатр) сабраліся прафесары і савецка-партыйныя лідары і пажадалі БДУ як мага хутчэй рэальна распачаць сваю дзейнасць.

У. І. Пічэта – першы рэктар

Гэта першы будынак, дзе размяшчаўся БДУ (1921–1929 гг.)

І толькі пасля напружанай працы па падрыхтоўцы ўмоў для правядзення заняткаў на трох факультэтах (на гэта спатрэбілася яшчэ каля чатырох месяцаў) было прынята рашэнне вызначыць 30 кастрычніка 1921 г. для афіцыйнага абвяшчэння: Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт распачынае працу. Рашэнне было прынятае самім калектывам БДУ – на пасяджэнні савета факультэта грамадскіх навук (ФГН) 16 кастрычніка. Знакава, што тады ж зацвердзілі першыя вучэбныя планы двух аддзяленняў гэтага факультэта (грамадска-эканамічнага і этнолага-лінгвістычнага), вырашылі пытанне наконт памераў акладаў выкладчыкаў, намецілі да адкрыцця 9 вучэбных кабінетаў. Між тым толькі 29 кастрычніка была завершана падрыхтоўка раскладу заняткаў і вызначана дата першай лекцыі – «31 кастрычніка, у панядзелак, у 13.30, у актавай залі былога вучылішча Хайкіна, што на рагу вуліц Магазіннай і Багадзельнай».

Так званы «акт адкрыцця» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта адбыўся апоўдні 30 кастрычніка 1921 г. (у той жа актавай залі вучылішча Хайкіна) з удзелам прафесараў, выкладчыкаў і студэнтаў, а таксама партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва. З дакладамі выступілі рэктар У. І. Пічэта, прафесары І. М. Салаўёў і М. Б. Кроль, былі заслуханы шматлікія прывітанні.

Але да 30 кастрычніка 1921 г. давялося прайсці даволі цяжкі шлях. Пасля знакавай для ўсіх беларусаў пастановы ЦВК Беларусі ад 25 лютага 1919 г. аб неабходнасці будаваць СВОЙ універсітэт амаль адразу Наркамат асветы на пасяджэнні ў Мінску прыняў рашэнне аб стварэнні спецыяльнай камісіі па яго арганізацыі. Уся падрыхтоўчая работа стала праводзіцца членамі гэтай, мінскай, камісіі. Потым, з красавіка 1919 г., калі была створана яшчэ і маскоўская камісія, арганізацыйныя дзеянні пайшлі шпарчэй.

У пачатку 1921 г. мінская і маскоўская камісіі прыйшлі да высновы пра неабходнасць канцэнтрацыі паўнамоцтваў у руках невялікай колькасці найбольш энергічных і «прабіўных» сваіх членаў. Было вырашана стварыць часовае Праўленне будучага БДУ. Такім чынам, першае ўніверсітэцкае кіраўніцтва натуральна «вырасла» са складу падрыхтоўчых камісій. Ужо 16 сакавіка 1921 г. часовае Праўленне БДУ (Уладзімір Іванавіч Пічэта, Фёдар Фёдаравіч Турук, Захар Рыгоравіч Грынберг) распачало сваю дзейнасць.

Першае ж паўнамоцнае Праўленне БДУ было зацверджана пастановай калегіі Наркамата асветы Беларусі 8 ліпеня 1921 г. у складзе У. І. Пічэты (рэктар), У. М. Ігнатоўскага, Ф. Ф. Турука і М. Я. Фрумкінай. У жніўні да гэтага складу былі далучаны два студэнты, што падкрэслівала дэмакратычнасць універсітэцкага кіраўніцтва, адпаведнасць духу часу. Яшчэ адной праявай дэмакратызму ў дзеяннях Праўлення былі публічныя пасяджэнні: толькі за першы навучальны год іх адбылося 57 і былі прыняты 338 пастаноў па самых розных пытаннях універсітэцкага жыцця. І не толькі ўніверсітэцкага! БДУ з самага пачатку свайго існавання ставіў мэту стаць «центральным культурным очагом не только современной Белоруссии, но и соседних губерний, к ней примыкающих, Витебской, Гомельской, Смоленской», каб праз сваю дзейнасць «объединить смежные губернии» ў адзінай дзяржаве.

Акрамя Праўлення існаваў Савет БДУ, члены якога абіраліся на агульным сходзе супрацоўнікаў. Разам з прафесарамі і выкладчыкамі ў яго склад абіраліся (а таксама і прызначаліся) прадстаўнікі ЦВК рэспублікі, Наркамасветы, Мінгарвыканкама і іншых дзяржаўных арганізацый. У абавязковым парадку членамі савета былі і студэнты. На факультэтах таксама абіраліся саветы. Між тым універсітэцкі статут, які быў уведзены пасля зацвярджэння ў кастрычніку 1921 г. палажэння аб вышэйшых навучальных установах РСФСР, супрацьпаставіў саветам прадметныя камісіі, якія падпарадкоўваліся Праўленню БДУ і трымалі кіраўніцтва ўсім навучальным працэсам на факультэтах.

У адпаведнасці з новым Палажэннем аб ВНУ на Савеце БДУ 17 студзеня 1922 г. было абрана і новае Праўленне: У. І. Пічэта (рэктар), яго намеснікі – прафесары У. М. Іваноўскі і С. З. Кацэнбогін, намеснік загадчыка рабфака У. І. Корсак і студэнт медфака С. І. Баркусевіч (ён быў адметны не толькі сваёй высокай пасадай ва ўрадзе рэспублікі, але і тым, што ўзначальваў ваенную падрыхтоўку на медфаку, потым быў дыпработнікам, рэктарам медінстытута ва УССР).

Першыя факультэты ўзначалілі вядомыя на той час навукоўцы. Гэтыя прызначэнні былі прэрагатывай Праўлення БДУ. Так, першым дэканам медфака рашэннем Праўлення ад 31 кастрычніка 1921 г. быў зацверджаны прафесар Б. М. Беркенгейм, якога хутка змянілі біёлаг А. У. Фядзюшын, потым медык С. П. Сакалоўскі і нарэшце – прафесар М. Б. Кроль. Першым дэканам факультэта грамадскіх навук стаў гісторык У. М. Ігнатоўскі (яго намеснікам быў малады беларускі філосаф С. Я. Вальфсон). Ігнатоўскі ж у канцы жніўня 1922 г. быў прызначаны кіраваць новым факультэтам – педагагічным (яго намеснікі – гісторык М. М. Нікольскі і матэматык І. С. Пятосін). Пасля гэтага ФГН узначаліў С. З. Кацэнбогін – прафесар-сацыёлаг. Такім чынам, першае кіраўніцтва факультэтаў было выключна з прафесараў.

Адна з галоўных задач, якая беларускім урадам і арганізатарамі БДУ была вырашана перш за ўсе астатнія, гэта перадача ўніверсітэту больш-менш прыстасаваных і не разбураных падчас акупацый і рэвалюцыйных падзей будынкаў для правядзення вучэбных заняткаў. Пра гэта ўжо 10 сакавіка 1919 г. занепакоена гаварылі на пасяджэнні камісіі па арганізацыі БДУ. Абмеркавалі дзеянні, як атрымаць будучаму ўніверсітэту будынак былога камерцыйнага вучылішча, дзе месціліся ваенныя курсы Заходняй дывізіі. У хуткім часе было прынята рашэнне пра перадачу БДУ будынкаў былых мужчынскай гімназіі, духоўнай семінарыі, жаночага духоўнага вучылішча, вайсковага шпіталя, губернскай земскай бальніцы, рэальнага вучылішча

Студэнцкае фота Пятра Глебкі

Хайкіна, гімназіі Фальковіча і інш.

Але толькі 18 красавіка 1921 г. спецыяльнай пастановай Прэзідыума ЦВК Беларусі быў афіцыйна зацверджаны спіс будынкаў, якія пераходзілі «для нужд» БДУ. Акрамя пералічаных будынкаў, у спісе былі названыя памяшканні фабрыкі «Вікторыя», яўрэйскай бальніцы, Рускага сходу, гаспадарка «Лошыца» з фальваркамі «Зацішша», «Дуброва», «Прылукі», лясная дача Ваньковіча.

Асобнае месца ў гэтым дастаткова доўгім пераліку займаюць будынкі гімназіі Фальковіча і Зубакіна і вучылішча Хайкіна. Менавіта тут размясцілася першае Праўленне БДУ, тут распачаліся першыя лекцыі, адчыніліся дзверы ўніверсітэцкай бібліятэкі, якая хутка стала дзяржаўнай. Так, у гісторыю ўніверсітэта будынак былой гімназіі Канстанціна Восіпавіча Фальковіча і Сяргея Пятровіча Зубакіна ўвайшоў як «першы дом БДУ», бо ў ім працаваў рэктар, дзейнічала бібліятэка і канцылярыя, вяліся заняткі на рабочым факультэце. Гэты будынак стаяў на рагу вуліц Магазіннай і Кашарнай яшчэ з 1863 г. З гадамі мяняліся ўладальнікі гэтага неардынарнага па сваёй архітэктуры невысокага дома. Мяняліся і назвы вуліц, на якіх ён стаяў: Кашарная стала называцца Батальённай, потым – Скобелеўскай, пры савецкай уладзе і сёння – Чырвонаармейскай. Магазінная вуліца (і гэта знамянальна) з 1921 года атрымала назву Універсітэцкай (цяперашняя імя Кірава), бо на ёй стаялі галоўныя будынкі БДУ: і «Дом № 1», і «Дом № 2» – будынак былой фабрыкі «Вікторыя», дзе праводзіў заняткі па анатоміі медфак, і «Дом № 3» – будынак былога вучылішча Эмануіла Хайкіна, у якім адбылося ўрачыстае абвяшчэнне аб распачынанні дзейнасці БДУ і дзе прафесар-гісторык Д. П. Канчалоўскі 31 кастрычніка 1921 г. прачытаў першую лекцыю першым універсітэцкім студэнтам Беларусі, дзе вяліся заняткі факультэта грамадскіх навук.

І тады, і сёння, зразумела, без бібліятэкі ўніверсітэт не можа адбыцца і існаваць. З самага пачатку арганізацыйных дзеянняў асаблівыя намаганні рабіліся дзеля збору грунтоўнага бібліятэчнага фонду. Рашэннем Праўлення БДУ ад 15 кастрычніка 1921 г. ставілася задача стварэння бібліятэкі як фундаментальнай, разлічанай стаць «центральным книгохранилищем края, Государственной библиотекой Белоруссии» (так сведчаць дакументы таго часу).

Бібліятэка БДУ фактычна стала працаваць са снежня 1921 г. У якасці чытачоў запісалася каля 500 студэнтаў. У хуткім часе ёй былі перададзены ўсе ацалелыя кніжныя запасы, шмат кніг было даслана з Масквы. За грошы, якія вылучыў ЦВК Беларусі, набылі бібліятэкі Я. Ф. Карскага, М. А. Янчука, І. П. Карнілава, П. Л. Жуковіча, Я. Л. Дыла, Г. М. Маркава, І. Гурвіча з Нью-Ёрка, наркамата знешняга гандлю Беларусі. Усяго праз год дзейнасці БДУ ў яго бібліятэцы налічвалася звыш 100 тыс. тамоў. Універсітэцкай бібліятэкай штодзень карысталіся па некалькі сотень чытачоў – і не толькі студэнты, але і многія мінчане.

Шмат чаго можна было раскаваць пра першыя крокі нашага Універсітэта. Асабліва калі закрануць педагагічную і навуковую творчасць яго выдатных інтэлектуалаў. Але гэта фармат іншага распавядання – у хуткім часе чакаецца выхад адпаведнай кнігі. Напрыканцы прывяду яшчэ толькі адзін знакавы факт: атрыманне выпускніком БДУ дыплома з нумарам 1 аб заканчэнні прафесійнай адукацыі. Яго можна разглядаць у прамым параўнанні з датай 30 кастрычніка 1921 г. Тады наш Універсітэт распачаў дзейнасць, а ўжо 20 лютага 1925 г. студэнт Уладзімір Міхайлавіч Каракулька з рук рэктара атрымаў ПЕРШЫ ДЫПЛОМ (!) ПЕРШАГА БЕЛАРУСКАГА ЎНІВЕРСІТЭТА! Студэнт эканамічнага аддзялення (па адміністрацыйна-прамысловым цыкле) факультэта грамадскіх навук БДУ стаў кваліфікаваным эканамістам. Разам з ім новенькія, першыя для Беларусі, універсітэцкія дыпломы атрымалі яшчэ 59 яго аднакурснікаў.

Універсітэт адбыўся. Наперадзе пралягаў доўгі, адказны і пачэсны шлях па дарозе Ведаў!

Прафесар Алег ЯНОЎСКІ

Шлях адукацыйнага працэсу – развіццё

«Сістэма адукацыі ў пэўным сэнсе інертная. Любыя рэзкія рухі ні да чаго добрага не прыводзяць. Але адначасова – калі не будзем імкнуцца да інавацый, адказваць на запыты рынку, то застынем у сваім развіцці. Неабходна з мінулага браць найлепшае і імкнуцца наперад», – лічыць начальнік Галоўнага ўпраўлення навучальнай і навукова-метадычнай работы **Людміла ХУХЛЫНДЗІНА.** Мы даведаліся ў яе, якія змены адбываюцца ў адукацыйным працэсе нашага ўніверсітэта, якія выяўляюцца тэндэнцыі і як гэтага атрымалася дасягнуць.

Абітурыенты ў БДУ прыходзяць мэтанакіравана

Прыёмная кампанія пацвердзіла станоўчую тэндэнцыю: з году ў год колькасць прынятых абітурыентаў расце, прычым гэта тычыцца ўсіх формаў навучання. Прыцягнуць абітурыентаў дазваляе ў тым ліку і добра арганізаваная прафарыентацыйная праца. Факультэты праводзяць у школах, ліцэях і гімназіях рознага роду мерапрыемствы, прычым не толькі разавыя, але і ў рамках педагагічнай практыкі студэнтаў.

У факультэтаў ёсць школы-партнёры, сёння дамовы складзены больш як з 80 навучальнымі ўстановамі Мінска і Мінскай вобласці, вядзецца праца па супрацоўніцтве са школамі з іншых абласцей. Яшчэ адзін кірунак працы з абітурыентамі – масавыя мерапрыемствы. Вось ужо пяць гадоў праводзіцца «Фэст факультэтаў БДУ», на якім можна не толькі падрабязней даведацца пра спецыяльнасці, але і ўбачыць, чым жывуць ва ўніверсітэце студэнты. Сёлета ўпершыню прайшла рэспубліканская «Універсітэцкая субота», у якой наш універсітэт прыняў актыўны ўдзел.

Вельмі важная праца праводзіцца «школамі юных», якія працуюць на шматлікіх факультэтах. Сёлета з'явіліся новыя – «Школа юнага хіміка» і «Школа будучага лагіста-міжнародніка». Заняткі ў іх накіраваны не столькі на падрыхтоўку да цэнтралізаванага тэсціравання, колькі на паглыбленае вывучэнне прадмета, знаёмства з прафесіяй. Прымаюць не толькі вучняў выпускных класаў: напрыклад, на механіка-матэматычным факультэце займаюцца са школьнікамі, пачынаючы з 5 класа. Людміла Хухлындзіна адзначае:

– У «школах юных» дзеці бачаць, што такое лабараторыі, якім чынам у іх працаваць, пад кіраўніцтвам выкладчыкаў пішуць навукова-даследчыя працы – гэта фарміруе зацікаўленасць, таму абітурыенты да нас прыходзяць мэтанакіравана.

Узровень падрыхтоўкі студэнтаў расце

Мала набраць добрых абітурыентаў, важна не пазбавіцца часткі студэнтаў пасля першай сесіі. Падобнае БДУ не пагражае: яшчэ адна станоўчая тэндэнцыя паказвае, што ўзровень падрыхтоўкі студэнтаў расце:

– Па выніках летняй сесіі ўзровень паспяховасці значна вырас, нават у параўнанні з мінулым годам, – адзначае Людміла Хухлындзіна. – У гэтым сваю ролю сыгралі шматлікія фактары, у тым ліку ўвядзенне платных пераздач.

Калі ў 2014/2015 навучальным годзе абсалютная паспяховасць студэнтаў дзённай формы навучання ў летнюю сесію складала 78,9 %, то ў мінулым годзе яна павялічылася да 82,4 %. Такіх высокіх паказчыкаў не атрымлівалася дасягнуць з 2008/2009 навучальнага года. Пацешылі і першакурснікі (цяперашнія другакурснікі): упершыню за многія гады павялічылася колькасць тых студэнтаў, хто здаў сесію на 9-10 балаў, а тых, хто атрымаў тры нездавальняльныя адзнакі, паменшылася.

«Атрымліваюць» па ведах

Стымул вучыцца добра – стыпендыя, яна ў студэнтаў БДУ самая высокая па краіне. А ў тых, хто вучыцца на платнай аснове, ёсць магчымасць атрымаць зніжку. Умовы такія: высокая паспяховасць, навукова-даследчая праца і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці ўніверсітэта.

У 2015 і 2016 гг. у палажэнні пра зніжкі былі занесены асобныя змены, новая рэдакцыя набыла моц у верасні 2016 года. З 2015 г. прэтэндаваць на зніжку могуць і замежныя грамадзяне. Ім далі такую магчымасць, каб матываваць добра вучыцца:

– Студэнты-замежнікі плацяць значна больш, чым грамадзяне Беларусі, – распавядае Людміла Хухлындзіна. – Часцяком студэнты лічаць, што раз яны досыць шмат плацяць, то і вучыцца могуць, асабліва не напружваючыся: не заўсёды своечасова здаюць сесію, часам спекулююць на тым, што дрэнна ведаюць мову, чагосьці не разумеюць. Распаўсюджанне зніжак на замежных студэнтаў, на наш погляд, будзе спрыяць іх большай матывацыі.

Зменшыць кошт навучання на 2016/2017 навучальны год змаглі 509 студэнтаў БДУ, з іх атрымалі максімальную зніжку, якая складае 60 % – 160. У гэтым ліку і замежнікі, напрыклад, студэнт механіка-матэматычнага факультэта Раўшэн Атаеў, які мае сярэдні бал паспяховасці 10.

Дарэчы, сёння геаграфія краін, з якіх на вучобу ў БДУ прыязджаюць студэнты, шырокая. Сёлета сярод залічаных грамадзяне Ірана, Ірака, Казахстана, ЗША, Японіі, Карэі, Чэхіі, Узбекістана, Турцыі, Мазамбіка, Нігерыі, Літвы, Латвіі, Індыі, Італіі, Германіі і інш. Іх высокая паспяховасць для БДУ – пытанне прэстыжу:

– Мы зацікаўлены ў тым, каб студэнты-замежнікі добра вучыліся. Бо яны вяртаюцца на радзіму, і там іх статус, тое, як яны працуюць – усё кажа пра тое, якую адукацыю яны атрымалі.

Рэйтынгавая сістэма будзе ўдасканальвацца

Летась у палажэнне пра рэйтынгавую сістэму ацэнкі ведаў унеслі змены, як адзначыла Людміла Хухлындзіна, зроблена гэта было ўсё з той жа мэтай: матываваць студэнтаў вучыцца. Прынцып працы сістэмы просты: тым, хто дастаткова актыўны, працуе на працягу ўсяго семестра, лягчэй будзе здаць іспыт.

Галоўная ж змена ў палажэнні звязана з «аўтаматамі». Ёсць цэлы шэраг дысцыплін, тэмы па якіх цалкам пакрываюцца семінарскімі, практычнымі і лабараторнымі заняткамі. І калі студэнт праходзіць, а затым у розных формах дае справаздачу па ўсіх тэмах, то дапускаецца паставіць на іспыце адзнаку «аўтаматам».

Студэнтаарыентаванае навучанне

Беларусь далучылася да Балонскага працэсу ў 2015 годзе, аднак наша краіна, і БДУ ў тым ліку, пачала ісці ў кірунку сусветных тэндэнцый задоўга да гэтай даты. Напрыклад, пераход на вымярэнне працаёмкасці адукацыйнага працэсу ў крэдытах пачалі ажыццяўляць з 2008 года. Тады ў адукацыйных стандартах упершыню працаёмкасць была прапісана не толькі ў звыклых акадэмічных гадзінах, але і ў крэдытах. Сёння яны ўжо паказваюцца ў заліковых кніжках студэнтаў. А ў адукацыйных стандартах трэцяга пакалення, якія набылі моц з верасня 2013 года, прасунуліся яшчэ далей: павялічыўся аб'ём дысцыплін па выбары. Гэтыя змены звязаны ў тым ліку і з імкненнем зрабіць навучанне больш арыентаваным на студэнтаў, дамагчыся таго, каб яны сапраўды вучыліся – імкнуліся атрымліваць веды.



Калі параўнаць навучальныя планы 2008 і 2013 гадоў (па першых вучыцца цяперашні пяты курс, па другіх – чацвёрты), то можна адзначыць, што і аўдыторная нагрузка на студэнтаў паменшылася, вырас аб'ём самастойнай працы. Праўда, студэнты не заўсёды гатовыя да самастойнасці.

– Трэба зразумець, што на лекцыях немагчыма выказаць увесь аб'ём неабходнага для засваення матэрыялу. Задача выкладчыка – даць вектар, кірунак вывучэння матэрыялу, растлумачыць найбольш складаныя палажэнні. А далей студэнт павінен працаваць самастойна ў бібліятэцы, у лабараторыі, дома, здабываць веды, – зазначае Людміла Хухлындзіна.

У сучаснай навучальна-праграмнай дакументацыі надаецца вялікая ўвага пераліку кампетэнцый, якімі павінен валодаць малады спецыяліст, у тым ліку якія фарміруюцца пры засваенні той ці іншай дысцыпліны. З гэтай мэтай ствараюцца і кароткія анатацыі навучальных дысцыплін.

Далучэнне Рэспублікі Беларусь да Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі – не аднамомантная з'ява, а працяглы працэс. Яно адкрывае дадатковыя магчымасці для ўдзелу ўніверсітэта ў еўрапейскіх праектах, у рэалізацыі акадэмічных абменаў і інш.

Актуальным застаецца пытанне пра перспектывы развіцця магістратуры.

– Пераход на чатырохгадовы тэрмін навучання пацягнуў за сабой скарачэнне галоўным чынам цыкла дысцыплін спецыялізацый. Меркавалася, што паглыбленае вывучэнне спецыяльнасці будзе ажыццяўляцца на другой ступені. Дзейныя адукацыйныя стандарты другой ступені не заўсёды прадугледжваюць такую магчымасць (асабліва гэта тычыцца навукова-арыентаванай магістратуры). Улічваючы, што ў 2017 г. будзе ўпершыню ажыццёўлены выпуск спецыялістаў з 4-гадовым тэрмінам навучання, Міністэрства адукацыі даручыла навучальна-метадычным аб'яднанням ВНУ краіны падрыхтаваць прапановы па занясенні змен у дзейныя адукацыйныя стандарты да канца каляндарнага года, у тым ліку ў частцы, якая тычыцца тэрмінаў навучання.

Гутарыла
Валерыя БАНДАРЧЫК



Новыя рэаліі ў навуцы

БДУ валодае развітой навукова-тэхнічнай базай, кадравым патэнцыялам, што робіць яго магутным рэсурсам развіцця інавацыйнай эканомікі краіны. Галоўнае ўпраўленне навукі (ГУН) – навуковае структурнае падраздзяленне, якое забяспечвае арганізацыю, каардынацыю і ажыццяўленне навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці комплексу БДУ. Якія пазіцыі ў краіне займае наш навуковы комплекс, раскажам падрабязна.

Структура ГУН

Як структура Галоўнае ўпраўленне навукі было створана ў 1963 годзе і на той час мела назву НДС (навукова-даследчы сектар). Цяпер кіраўніком з'яўляецца намеснік прарэктара па навуковай рабоце кандыдат фізіка-матэматычных навук Віталь КУТАВІЧУС. Восем аддзелаў працуюць па трох напрамках, якія курыруюць намеснікі кіраўніка ГУН. За арганізацыю і суправаджэнне навукова-даследчых і доследна-канструктарскіх прац адказвае Яўген Анціпін, за навукова-інавацыйную дзейнасць – Алег Янкоўскі, а за падрыхтоўку кадраў вышэйшай кваліфікацыі – Аляксандр Захараў.

Праца ГУН накіравана на навуковую дзейнасць універсітэта. На сёння ў навуковую сферу БДУ ўваходзяць 4 навукова-даследчыя інстытуты, 2 нацыянальныя навуковыя цэнтры, 5 інавацыйных прадпрыемстваў, 16 факультэтаў. А колькасць штатных навуковых працаўнікоў комплексу складае 461 чалавек. Таксама ў навуковым працэсе ўдзельнічае прафесарска-выкладчыцкі склад і высокакваліфікаваныя інжынеры-даследчыкі ў навуковых інстытутах і цэнтрах.

Віталь Кутавічус адзначае: «ГУН – адміністрацыйная структура комплексу БДУ, якая імкнецца стварыць камфортныя ўмовы для развіцця навукі ва ўніверсітэце. Дзейнасць ГУН накіравана на непарыўнае функцыянаванне навукі, адукацыі і вытворчасці. У тым ліку рыхтуем навуковых працаўнікоў вышэйшай кваліфікацыі ў аспірантуры і дактарантуры».

Навуковыя праграмы БДУ

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт – адна з вядучых устаноў вышэйшай адукацыі на рынку навукова-тэхнічных распрацовак. У 2016 годзе па плане навукова-даследчых, доследна-канструктарскіх і доследна-тэхналагічных работ выконваецца 292 тэмы ў 12 дзяржаўных праграмах, якія рэалізоўваюцца ў адпаведнасці з прыярытэтнымі напрамкамі навуковых даследаванняў Рэспублікі Беларусь. У 10 праграмах БДУ з'яўляецца галаўной арганізацыяй-выканаўцам. Сярод іх: «Энергетычныя сістэмы, працэсы і тэхналогіі», «Хімічныя тэхналогіі і матэрыялы», «Біятэхналогіі», «Інфарматыка, космас і бяспека», «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства» і іншыя. Весці такую працу ўніверсітэту дазваляе прафесіяналізм яго навукоўцаў.

Інавацыі

У базе навукова-тэхнічнай прадукцыі комплексу БДУ зарэгістравана каля 400 распрацовак. І гэта колькасць увесь час павялічваецца.

У краіне ўніверсітэт займае першыя пазіцыі ў галіне распрацоўкі і стварэння лекавых сродкаў для барацьбы з ракавымі клеткамі. На вытворчасці РУП «Унітэхпрам БДУ» сумесна з НДІ фізіка-хімічных праблем наладжаны выпуск лекавага прэпарата «Цысплацел», прызначанага для лакальнай хіміятэрапіі злаякасных новаўтварэнняў галаўнога мозгу і пухлін у вобласці галавы і шыі. Таксама створаны супрацьпухлінныя субстанцыі «Тэмазаламід», «Праспідыю хларыд» і арыгінальная субстанцыя «Нітаргал» для вытворчасці прэпаратаў, якія ўжываюцца пры лячэнні сардэчна-сасудзістых захворванняў. Фармацэўтычная прадукцыя распрацавана па поўным інавацыйным цыкле, ад фармулёўкі тэхнічнага задання да серыйнай вытворчасці.

НДУ «Інстытут ядзерных праблем» атрымаў ліцэнзію на права ажыццяўляць дзейнасць, якая звязана з уздзеяннем на навакольнае асяроддзе. З дапамогай распрацаванага ў інстытуце новага комплексу абсталявання на аснове мікрахвалевай тэхналогіі будуць ажыццяўляцца паслугі па абясшкоджванні небяспечных медыцынскіх адходаў і перамяшчэнне іх у групу бытавых.

На прадпрыемстве ЗТАА «Русбелгаз» у Брэсце асвоена вытворчасць і пачаўся серыйны выпуск бытавых ультрагукавых лічыльнікаў газу РБГ У тыпапамераў G1,6, G2,5, G4 і G6 з прывядзеннем вымеранага аб'ёму газу да стандартных умоў і магчымасцю перадачы інфармацыі ў аўтаматызаваную сістэму ўліку камерцыйнага газу. Гэта распрацоўка спецыялістаў НДІ прыкладных фізічных праблем імя А. Н. Сеўчанкі БДУ.

Раскрутка прадукцыі

«Маркетынгавая дзейнасць ГУН накіравана на пошук патэнцыйных партнёраў, пакупнікоў, якім паказваем нашы магчымасці. Забяспечваецца падрыхтоўка і ўдзел БДУ ў розных выставах і мерапрыемствах, мэтай якіх з'яўляецца камерцыялізацыя інавацыйных ідэй і праектаў», – распавядае Віталь Кутавічус. – Дарэчы, за 9 месяцаў 2016 года ўніверсітэт удзельнічаў у 11 міжнародных, нацыянальных і спецыялізаваных выставах, у 5 выставах у рамках падзей рэспубліканскага ўзроўню».

Спецыялісты БДУ прымалі ўдзел у наступных мерапрыемствах: Беларуска-прыбалтыйскі форум, IX з'езд анколагаў і радыёлагаў краін СНД і Еўразіі, X пецярбургскі кірмаш «Санкт-Пецярбург – рэгіёны Расіі і замежжа», семінар і кантактна-кааперацыйная біржа «Энергаэфектыўнасць і зялёная энергетыка: вопыт і рашэнні паўночных краін» і гэтак далей. Распрацоўкі ўніверсітэта былі прадстаўлены на двух міжнародных конкурсах, па выніках якіх узнагароджаны 8 залатымі, 8 сярэбранымі медалямі і дыпломам трэцяй ступені.

Навукова-тэхнічная прадукцыя комплексу БДУ карыстаецца попытам за мяжой. У 2015 г. факультэты і навукова-даследчыя падраздзяленні БДУ ажыццяўлялі супрацоўніцтва па 407 дамовах і пагадненнях з замежнымі адукацыйнымі і навукова-даследчымі ўстановамі, арганізацыямі з 50 краін. Асноўнымі міжнароднымі партнёрамі традыцыйна з'яўляюцца ВНУ і навуковыя арганізацыі Расіі (125 дамоў). Таксама сярод буйных партнёраў Германія (43 дамовы) і Польшча (39 дамоў).

Студэнцкая навука

Адзін з напрамкаў працы ГУН – навукова-даследчая работа студэнтаў. Яна з'яўляецца важным сродкам павышэння якасці падрыхтоўкі выпускнікоў, здольных творча прымяняць у практычнай дзейнасці апошнія дасягненні навукова-тэхнічнага і культурнага прагрэсу. Рознымі формамі НДРС ва ўніверсітэце ў пазавучэбны час штогод займаецца каля 10 000 студэнтаў, што складае амаль 47 % ад агульнага ліку студэнтаў і магістрантаў дзённай формы навучання. У выкананні планавых дзяржбюджэтных і гаспадарчадамоўных навукова-даследчых і доследна-канструктарскіх прац штогод удзельнічае амаль 800 студэнтаў, у тым ліку каля 500 працуюць на ўмовах аплаты. У 42 студэнцкіх навукова-даследчых лабараторыях і іншых навуковых, творчых аб'яднаннях працуюць больш за 3000 студэнтаў. На працягу 2015 года на навуковых канферэнцыях рознага ўзроўню было прачытана 5794 даклады студэнтамі і магістрантамі.

«Прыцягненне да навукова-даследчай працы дазваляе навучыць студэнтаў выкарыстоўваць іх творчы і працоўны патэнцыял, – кажа кіраўнік ГУН Віталь Кутавічус. – Сістэма стымулявання падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў і навуковых працаўнікоў ва ўніверсітэце прадугледжвае шэраг конкурсаў штогод».

Сярод іх конкурс грантаў для студэнтаў і аспірантаў БДУ, дзе штогод удзельнічае да 50 праектаў па прыродазнаўчых і сацыяльна-гуманітарных навуках. Па выніках конкурсу ўзнагароджваюцца як найбольш актыўныя ўдзельнікі конкурсу, так і іх навуковыя кіраўнікі. На гэта ў 2016 годзе рэктарам было вылучана 19,5 тыс. дэнамінаваных рублёў.

Таксама студэнты, магістранты, выпускнікі БДУ прымаюць удзел у рэспубліканскім конкурсе навуковых прац студэнтаў. Як правіла, штогод універсітэт прадстаўляе амаль 250 работ, з іх каля 70 % звычайна атрымліваюць катэгорыі. Па выніках XXII рэспубліканскага конкурсу, які праходзіў у 2015 годзе, 10 прац студэнтаў БДУ атрымалі званне лаўрэата.

За актыўны ўдзел у навукова-даследчай працы і паспяховасць штогод больш за 100 прадстаўнікоў БДУ заахвочваюцца спецыяльным фондам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў.

БДУ супрацоўнічае з Акадэміяй навук. На многіх кафедрах знешнімі сумяшчальнікамі працуюць супрацоўнікі НАН Беларусі, у сваю чаргу студэнты праходзяць у інстытутах акадэміі практыку, выконваюць курсавыя і дыпломныя працы, працуюць на абсталяванні ў акадэмічных лабараторыях, ставяць сумесныя эксперыменты. Функцыянуюць 30 філіялаў кафедраў БДУ ва ўстановах НАН Беларусі, дзе выконваецца вучэбная, навукова-даследчая і вучэбна-метадычная праца.

Відэаспектральная сістэма, распрацаваная НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі БДУ, на борце Міжнароднай касмічнай станцыі

Падрыхтоўка і абарона

Высокая эфектыўнасць сістэмы навукова-даследчай работы студэнтаў пацвярджаецца вынікамі паступлення выпускнікоў БДУ ў аспірантуру. Цяпер у аспірантурах устаноў вышэйшай адукацыі і НАН навучаецца прыкладна 820 выпускнікоў нашага ўніверсітэта, пры гэтым большая частка з іх (470 чалавек) у аспірантуры БДУ.

Пры БДУ дзейнічае 21 савет па абароне дысертацый. Яны забяспечваюць экспертызу дысертацый па 58 навуковых спецыяльнасцях. У перыяд з 2014 па кастрычнік 2016 года ў саветах па абароне дысертацый прайшлі 254 абароны па розных напрамках.

Каму і дзеля чаго наогул варта займацца навукай? Віталь Кутавічус адказвае на гэта так: «Лічу, што навука звязана з творчасцю. А важная прыкмета творчасці – гэта ўнікальнасць атрыманага дасягнення. Часам нават сам аўтар не можа прадбачыць, што атрымаецца ў выніку яго творчага асэнсавання рэальнасці. Для навукоўца павінна быць характэрна імкненне выказаць сваё разуменне свету. Таксама ў аснове ўсіх дасягненняў навукі першапачаткова ляжыць цікаўнасць. Чым бы ні займаўся навуковец, ён шукае адказ на пытанне: «А што будзе, калі...?» Цікаўнасць – гэта цяга да пазнання».

Алена ЛЯЎШЭНЯ

Выпускнікамі БДУ

За 95 гадоў дзейнасці Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт даў пуцёўку ў жыццё каля 160 тыс. маладых спецыялістаў, у тым ліку больш чым 7 тыс. для іншых краін.

З цягам часу многія выхаванцы БДУ выраслі ў выбітных выкладчыкаў, навукоўцаў, грамадскіх дзеячаў, буйных кіраўнікоў і прадпрымальнікаў. Шмат хто з іх атрымаў прызнанне не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Некаторыя з такіх асоб павіншавалі альма-матар праз нашу газету.

Міхаіл ЖУРАЎКОЎ
Міністр адукацыі Беларусі

Ад усёй душы віншую Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт з юбілеем! Жадаю БДУ пастаянна развівацца, удасканальваць якасць адукацыйных паслуг, распрацоўваць новыя навуковыя праекты і выступаць лідарам інавацыйнай дзейнасці! БДУ – гэта брэнд, знак якасці, твар вышэйшай адукацыі Беларусі, гонар нашай краіны.
З юбілеем, БДУ!

Лілія АНАНІЧ
Міністр інфармацыі Беларусі

БДУ – вядучая вышэйшая навучальная ўстанова нашай краіны, адна з «візітных картак» Беларусі. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт заўсёды быў у авангардзе грамадскага і навуковага жыцця, актыўна ўдзельнічаў у стваральным будаўніцтве беларускай дзяржаўнасці, і зараз рупліва ўмацоўвае суверэнітэт нашай краіны.

З'яўляючыся крыніцай перадавых навуковых ведаў, універсітэт стаў сусветна вядомым навуковым цэнтрам. За 95-гадовую гісторыю ў БДУ сфарміраваліся аўтарытэтныя навуковыя школы, выраслі спецыялісты з сусветным імем. Агульнавядомымі сталі іх даследаванні тэарэтычных і прыкладных праблем у галіне матэматыкі, фізікі, хіміі, біялогіі, навук аб Зямлі, гуманітарных і сацыяльных навук.

Папулярызацыя і прапаганда ўніверсітэцкіх ведаў – важная складаная частка і нфармацыйнай прасторы Беларусі. Нашы сумесныя намаганні скіраваны на плённае супрацоўніцтва ў выкананні дзяржаўных задач, выхаванне ў студэнцкай моладзі грамадзянскай адказнасці і патрыятызму, фарміраванне высокіх прафесійных якасцяў.

Шчыра жадаю вам здароўя, плёну ва ўсіх пачынаннях, аптымізму, творчых поспехаў і навуковых дасягненняў на карысць роднай Беларусі!

Валерый МІЦКЕВІЧ
Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

З'яўляючыся першай класічнай ВНУ на тэрыторыі Беларусі ў XX стагоддзі, універсітэт паспяхова вырашыў найскладанейшую задачу па фарміраванні асноў навуковага забеспячэння і вышэйшай адукацыі ў дзяржаве.

З трох факультэтаў, на якіх у 1921 годзе навучалася ўсяго 1390 студэнтаў, універсітэт пераўтварыўся ў найбуйнейшы ўніверсітэт Рэспублікі Беларусь, уваходзіць у топ-400 універсітэтаў свету з больш як 30 тысяч ВНУ.

Магутны навуковы, адукацыйны і культурны патэнцыял ВНУ дазваляе штогадова навучаць больш за 45 тысяч студэнтаў і слухачоў, фарміраваць навуковую і педагагічную школу краіны, праводзіць найважнейшыя навуковыя даследаванні.

За 95 гадоў ва ўніверсітэце зроблена шмат навуковых адкрыццяў, сфарміравана больш чым 60 навуковых школ, якія валодаюць заслужаным аўтарытэтам у краіне і за мяжой. Паспяхова асвойваюцца новыя галіны фундаментальных і прыкладных ведаў.

Выпускнікі ўніверсітэта валодаюць унікальнымі ведамі, якія дазваляюць ім займаць вядучыя пазіцыі ў розных сферах дзейнасці і прыносіць карысць дзяржаве. Дыплом БДУ не проста прызнаецца ў шматлікіх краінах свету, але і служыць надзейнай рэкамендацыяй яго ўладальніку.

У гэты ўрачысты дзень жадаю прафесарска-выкладчыцкаму складу, супрацоўнікам, аспірантам, студэнтам і выпускнікам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта росквіту і дабрабыту, прафесійных поспехаў, новых ідэй і энергіі для іх увасаблення, падтрымкі ва ўсіх распачынаннях на карысць alma mater і Рэспублікі Беларусь.

Генадзь ПАЛЬЧЫК
Старшыня Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь

Сардэчна віншую калектыў БДУ з 95-годдзем. За гэты перыяд БДУ зарэкамендаваў сябе як класічны ўніверсітэт са сваімі традыцыямі, шырокім спектрам навуковых школ па галінах прыродазнаўчанавуковага, тэхнічнага і гуманітарнага профіляў, вядучай адукацыйнай і навуковай установай краіны, што здабыла міжнародны аўтарытэт ва ўніверсітэцкай і навуковай супольнасці.

Ва ўніверсітэце выконваюцца фундаментальныя і прыкладныя навуковыя даследаванні, якія непарыўна звязаны з адукацыйным працэсам, што дазваляе эфектыўна ажыццяўляць падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў, што валодаюць сучаснымі метадамі рашэння навуковых і навукова-тэхнічных задач.

Значны ўклад БДУ ў падрыхтоўку і атэстацыю навуковых і навукова-педагагічных кадраў вышэйшай кваліфікацыі. У цяперашні час у БДУ дзейнічаюць 19 саветаў па абароне дысертацый, якія ажыццяўляюць экспертызу кваліфікацыйных навуковых прац па 57 навуковых спецыяльнасцях. За апошнія 10 гадоў у БДУ абаронены больш за 1000 дысертацый, з іх 84 дысертацыі – на суісканне вучонай ступені доктара навук.

Жадаем усім супрацоўнікам БДУ, яго ветэранам моцнага здароўя, здзяйснення задум, дабра і дабрабыту!

Пётр МІКЛАШЭВІЧ
Старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь

Стварэнне БДУ дало магутны імпульс развіццю беларускай вышэйшай адукацыі і навукі. Дзякуючы творчай працы шматлікіх выбітных педагогаў і навукоўцаў БДУ стаў вядучай ВНУ краіны, якая ажыццяўляе на высокім сучасным узроўні адукацыйную, навукова-даследчую і інавацыйную дзейнасць, набыў шырокую вядомасць за мяжой.

Адукацыйны працэс, у якім прафесійная падрыхтоўка спалучаецца з выхаваннем студэнтаў у духу патрыятызму, высокай грамадзянскасці і павагі да гісторыі і традыцый беларускага народа, дазваляе забяспечыць запатрабаванні розных галін эканомікі, дзяржаўнага кіравання ў высокакваліфікаваных спецыялістах. Выпускнікі БДУ ўносяць значны ўклад у развіццё Рэспублікі Беларусь як дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавы.

Жадаю новых дасягненняў у рэалізацыі творчых ідэй, развіцці нацыянальных традыцый універсітэцкай адукацыі.

Сяргей ЧЫЖЫК
Намеснік старшыні прэзідыума НАН Беларусі



Творчы шлях БДУ адзначаны ўражлівымі дасягненнямі ў падрыхтоўцы спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі для нашай краіны. Дзясяткі тысяч выпускнікоў, выхаваных у сценах універсітэта, годна прадастаўляюць яго ў Нацыянальнай акадэміі навук, вядучых галінах прамысловасці, у сістэме адукацыі Беларусі і іншых краін. Вы справядліва можаце ганарыцца ўнікальным прафесарска-выкладчыцкім складам, які рыхтуе новыя пакаленні спецыялістаў і даследчыкаў, стварэннем новых навуковых школ, высокім метадычным і прафесійным узроўнем навучальнага працэсу.

У НАН Беларусі высока шануюць плённае супрацоўніцтва з БДУ па шырокім коле навуковых праблем. Мы ўпэўненыя, што нашы кантакты па стварэнні новых высокаэфектыўных тэхналогій і ўкараненні ў практыку навуковых распрацовак будуць і далей эфектыўна спрыяць павышэнню ўзроўню і канкурэнтаздольнасці беларускай эканомікі.

Паважаныя калегі! Ад усёй душы жадаем вам новых здзяйсненняў і адкрыццяў, ажыццяўлення ўсіх творчых задум і росквіту.

Сяргей РАХМАНАЎ
Старшыня пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу

Дарагія ўніверсітэцкія сябры і калегі! З вялікім задавальненнем віншую вас з 95-годдзем славутай alma mater, якая іграла і заўсёды будзе іграць адну з галоўных роляў у жыцці беларускага грамадства, у нашым з вамі жыцці і ў жыцці нашых нашчадкаў.

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт шмат у чым вызначае прывабны твар і высокі інтэлектуальны ўзровень нацыі, аказвае вялікі ўплыў на пазітыўнае ўспрыманне Беларусі ў свеце як краіны з годнай адукацыяй, навукай, тэхналогіямі, эканомікай і культурай.

Асабіста для мяне наш універсітэт назаўжды з'яўляецца адной з найважнейшых кропак апоры пры любых жыццёвых сітуацыях – незалежна ад адлегласці, што нас аддзяляе. Нязменна цёплыя пачуцці да ўсёй універсітэцкай супольнасці я асабліва адрасую хімікам універсітэта, маім настаўнікам, калегам і навукоўцам, а таксама ўсім маім добрым сябрам у розных падраздзяленнях універсітэта.

Наш родны ўніверсітэт заўсёды стаяў перад неабходнасцю рашэння самых складаных задач, якія часам маглі падацца невыканальнымі. Аднак адэкватныя рашэнні знаходзіліся, і ўніверсітэт ішоў наперад.

У ліку іншых выпускнікоў я заўсёды выяўляю поўную гатоўнасць падтрымаць высілкі ўніверсітэцкай супольнасці па рэалізацыі высакароднага прызначэння alma mater.

Віктар БАБАРЫКА
Старшыня праўлення ААТ «Белгазпрамбанк»

Універсітэт прайшоў слаўны шлях у 95 гадоў, быў сведкам розных эпох. Але зараз нават для чалавека 95 гадоў не ўзрост адпачынку, а час тварэння і творчасці. Для ўніверсітэта гэта тэрмін прыняцця выклікаў глабальнай трансфармацыі. Наша alma mater ва ўсе часы вылучалася здольнасцю гадаваць таленты, здольныя сістэмна вырашаць задачы, вучыць комплекснаму падыходу да ведаў, развіваць шырокі погляд на прыроду свету. Я жадаю, каб сёння, у эпоху цывілізацыйнага зруху і новых мабільнасцяў, БДУ не кансерваваў свае традыцыі і дасягненні, а даваў слухачам уменні, веды і прылады адаптацыі і спазнання гэтага новага свету.

Вячаслаў СЦЁПІН
Акадэмік Расійскай акадэміі навук, прэзідэнт Расійскага філасофскага грамадства, ганаровы прафесар БДУ

Для мяне БДУ – самы прыцягальны полюс на нашай планеце. Можа, таму, што гэта мая маладосць, радасць сяброўскіх зносін, першыя самастойныя крокі ў навуцы. БДУ заслужана з'яўляецца для рэспублікі сімвалам высокіх стандартаў у навуцы, адукацыі, творчасці.

Сёння факультэты і інстытуты, навуковыя цэнтры і лабараторыі, выкладчыкі і студэнты БДУ актыўна працуюць разам з вядучымі расійскімі ўніверсітэтамі, выконваюць сумесныя навуковыя праекты з Расійскай акадэміяй навук, працягваючы найлепшыя традыцыі адукацыйнага і навуковага супрацоўніцтва, закладзеныя яшчэ ў перыяд стварэння ўніверсітэта ў беларускай сталіцы.

Віншую ўсіх выкладчыкаў і

ганарыцца краіна

студэнтаў, выпускнікоў з 95-годдзем БДУ! Поспехаў вам, новых здзяйсненняў і адкрыццяў!

Валянцін СУКАЛА
Старшыня Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь

Гісторыя ўніверсітэта непарыўна звязаная з гісторыяй нашай Бацькаўшчыны. Белдзяржуніверсітэт прайшоў доўгі шлях станаўлення і развіцця і справядліва лічыцца флагманам вышэйшай адукацыі ў нашай краіне. Універсітэт эфектыўна вырашае задачы асветы, папулярызацыі навуковых ведаў і развіцця культуры, што значна ўплывае на сацыяльна-эканамічныя працэсы ў дзяржаве.

Ва ўсе часы БДУ з'яўляўся кузняй высокакваліфікаваных кадраў. З ім непарыўна звязаныя імёны сусветна вядомых беларускіх навукоўцаў, дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў.

Нязменна высокія пазіцыі БДУ ў міжнародных рэйтынгах універсітэтаў прыцягваюць у яго кожны год тысячы абітурыентаў. Тыя, у каго атрымліваецца папоўніць шэрагі студэнцкай моладзі, прымнажаюць сваімі дасягненнямі найлепшыя ўніверсітэцкія традыцыі.

Універсітэт паспяхова ўдзельнічае ў працэсах міжнароднай інтэграцыі ў сферы навукі і адукацыі, развівае супрацоўніцтва з замежнымі ВНУ.

Шчыра жадаю калектыву БДУ і ўсім, хто тут працуе і вучыцца, творчай энергіі і натхнення на новыя адкрыцці і дасягненні!

Віталь САЛАДУХА
Генеральны дырэктар ААТ «Інтэграл»

Паклаўшы ў аснову адукацыі ва ўніверсітэце такія найважнейшыя прынцыпы, як фундаментальнасць, спецыялізацыя ў прыкладных галінах, абавязковы ўдзел студэнтаў у навукова-даследчай працы, вы дзякуючы вялікай і плённай працы зрабілі важкі ўклад у падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў у галіне радыёэлектронікі і яе сучасных прыкладанняў, дасягнулі значных поспехаў у сферы навукі.

Асабліва прыемна адзначыць наша шматгадовае плённае супрацоўніцтва па рэалізацыі шэрагу дзяржаўных навукова-тэхнічных праграм і тое, што нашы сумесныя працы па распрацоўцы новых метадаў праектавання і развіцця фізіка-тэхналагічных асноў стварэння высокіх тэхналогій вытворчасці канкурэнтаздольных вырабаў былі адзначаныя Дзяржаўнай прэміяй у галіне тэхнікі.

Упэўнены, што і далей нашы ўзаемавыгадныя сувязі будуць умацоўвацца на карысць нашай краіны.

Павел ЯКУБОВІЧ
Галоўны рэдактар газеты «СБ-Беларусь сегодня»

У далёкім 1921 БДУ стаў першай у нашай краіне ВНУ, і ўсе гэтыя гады застаецца флагманам вышэйшай адукацыі. Яго супрацоўнікі і выпускнікі зрабілі велізарны ўклад у эканоміку і народную гаспадарку, адукацыю і навуку, дзяржаўнае будаўніцтва і культуру нашай краіны. Усе вы, паважаныя сябры, робіце вялікую і важную справу!

Дасягненні ўніверсітэта высока шануюць у нашай роднай Беларусі і за мяжой. Пазіцыі БДУ ў сусветных рэйтынгах год ад году растуць. Так трымаць!

Ваш юбілей – радасная падзея і для нас. Бо сярод вашых выхаванцаў і журналісты, якія працуюць у «СБ». Таму сёння, шчыра віншуючы вас са знамянальнай датай, жадаем вам захоўваць і памнажаць славутыя традыцыі, заставацца арыенцірам для іншых ВНУ і заўсёды крочыць у нагу з часам: удасканальваць навучальны працэс, укараняць новыя тэхналогіі, развіваць міжнароднае супрацоўніцтва. Упэўненыя, напарадзе вас чакаюць маштабныя і гучныя здзяйсненні, а ў летапіс БДУ вашымі стараннямі будзе ўпісана шмат яркіх старонак!

Са святам!

Аляксандр ТУЗІКАЎ
Генеральны дырэктар Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі НАН Беларусі

Віншую з 95-годдзем мой родны БДУ, які выхаваў шмат выдатных прадстаўнікоў нашай краіны, наш гонар, інтэлектуальны капітал Беларусі. Кожны, хто прайшоў навучанне ва ўніверсітэце, набыў не толькі новыя веды, а штосьці значна большае, заклаў падмурак, жыццёвую аснову, якая дазваляе яму ўпэўнена будаваць сваё жыццё. Я шчаслівы, што жыццё дало мне магчымасць вучыцца ва ўніверсітэце, прасякнуцца яго духам і адчуць сябе датычным да вялікай сям'і яго выпускнікоў. З вялізным задавальненнем цяпер працягваю працаваць са студэнтамі ФПМІ. Шчыра віншую выкладчыкаў і студэнтаў, адміністрацыю ўніверсітэта і яго выпускнікоў з днём нараджэння і жадаю, каб Белдзяржуніверсітэт і далей заставаўся лідарам усёй сістэмы адукацыі ў Беларусі.

Рыгор КІСЕЛЬ
Старшыня праўлення ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал»

У савецкія часы БДУ быў адзіным універсітэтам у БССР, што давала яму асаблівы статус. Такі ж статус прэстыжу і выключнасці меў і журфак – таксама адзіны ў краіне.

Журфак для мяне – як лёсавызначальны водападзел. Да журфака – мара пра журналістыку, пасля – прафесія ўсяго жыцця.

Журфак навучыў не толькі пісьменна выказвацца, асабіста мяне ён навучыў думаць. Пэўна, менавіта таму мой журналісцкі шлях склаўся ўдала. І справа нават не ў тым, што я займаў нейкія кіраўнічыя пасады ў СМІ. Я не перастаў любіць гэтую прафесію і не стаміўся ад яе нават пасля 35 гадоў прафесійнага стажу.

А гэта значыць, што 5-гадовае навучанне было дасканалым. Хачу спадзявацца, што такім жа дасканалым яно з'яўляецца і зараз ужо для новага пакалення беларускіх журналістаў.

З днём нараджэння, мой універсітэт!

Андрэй РОГАЧ
Загадчык кафедры фатонных матэрыялаў, дырэктар-арганізатар цэнтра функцыянальнай фатонікі Універсітэта Ганконга

БДУ спаўняецца 95 гадоў – вельмі самавіты ўзрост, асабліва для маладой Беларусі! Але ж вядома, што ўніверсітэты ніколі не старэюць – толькі растуць у рэйтынгах. Калі я думаю пра альма-матар, я ўспамінаю сваіх бацькоў, якія, як і я, скончылі хімфак БДУ, сваіх аднакурснікаў і калегаў. Тое, кім мы сталі і чаго дасягнулі, шмат у чым вызначаецца нашай адукацыяй, і гэта тое, што БДУ гарантавала ў мінулым і працягвае гарантавана забяспечваць усім сваім выпускнікам. Усяго самага найлепшага майму ўніверсітэту на яго шляху ў наступнае стагоддзе!

Максім МІРНЫ
Алімпійскі чэмпіён па тэнісе ў міксце; пераможца 50 турніраў АТР

Ад усяго сэрца віншую наш галоўную ВНУ дзяржаўны з гэтым выдатным Юбілеем!!! Нам сапраўды ёсць чым ганарыцца, бо ўніверсітэт выхаваў і падрыхтаваў не адну плеяду высакакласных і выбітных спецыялістаў. Ад сябе асабіста хачу выказаць падзяку, а таксама павіншаваць увесь выкладчыцкі склад кафедры міжнародных адносін, дзе мне пашчасціла атрымаць сваю спецыяльнасць і пазнаёміцца з найлепшымі педагогамі нашай краіны. Нізкі Вам паклон! Са святам, і ўсяго Вам добрага!

Аляксандр МАШЭНСКІ
Генеральны дырэктар СП «Санта Імпэкс Брэст»

З цеплынёй успамінаю гады вучобы і па-добраму зайздрошчу сённяшнім студэнтам. І не столькі ўзросту, колькі выдатнай магчымасці развівацца, заводзіць новых сяброў і спазнаваць сябе. Удзячны сваім Настаўнікам за тое, што навучылі аналізаваць і сістэмна думаць.

З задавальненнем звяртаюся да выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў: беражыце традыцыі Універсітэта, але ідзіце ў нагу з часам. І, вядома, віншую ўсіх нас з Юбілеем!

Аляксандр КІРКОЎСКІ
Камерцыйны дырэктар кампаніі EffectiveSoft

Як кіраўнік IT-кампаніі «Эфектыўныя праграмы» з цяжкасцю сабе ўяўляю, як развівалася б наша галіна без выпускнікоў ФПМІ. Студэнты выпускных, а часцяком і больш ранніх курсаў, ужо цалкам тэарэтычна і практычна падрыхтаваныя, каб без вялікіх праблем праходзіць стажыроўку ў кампаніях IT-галіны. Наша супрацоўніцтва з універсітэтам непасрэдна ў падрыхтоўцы студэнтаў вельмі эфектыўнае і плённае.

Прыемна бачыць, што ва ўніверсітэце прасочваецца сістэмны падыход у падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, інтэграцыі адукацыйнага працэсу, вытворчай практыкі і працаўладкавання, адсочванні далейшага лёсу сваіх выпускнікоў.

Сёння словы «скончыць БДУ» з'яўляюцца сінонімам слоў «атрымаць добрую працу». І ў гэтым я бачу заслугу выкладчыкаў маёй любай ВНУ.

Жадаю Універсітэту поспехаў, а яго выкладчыкам – плённай працы і далейшага прызнання яго заслуг!

Аляксей ШВАКАЎ
Старшыня Мінскай гарадской калегіі адвакатаў

Паважаныя сябры! Ад усёй душы віншую наш універсітэт з 95-годдзем!

БДУ займае адмысловае месца ў жыцці кожнага выпускніка. Атрыманыя тут веды і досвед дапамагаюць у працы і кар'ерным росце, а ўніверсітэцкія сябры застаюцца на ўсё жыццё. Наша alma mater заслужана з'яўляецца лідарам сярод ВНУ нашай краіны і займае годнае месца ў сусветным рэйтынгу. Мінская гарадская калегія адвакатаў, калектыў якой у пераважнай большасці складаюць выпускнікі БДУ, шчыра жадае найлепшай ВНУ краіны далейшага развіцця, росквіту і поспехаў ва ўсіх распачынаннях!

Дзмітрый ШЛЯХЦІН
Дырэктар музея Вялікай Айчыннай вайны

За доўгія гады свайго існавання БДУ дзякуючы плённай працы некалькіх пакаленняў адданых сваёй справе людзей стаў сапраўдным флагманам беларускай вышэйшай адукацыі і адным з найважнейшых цэнтраў айчыннай навукі. Аўтарытэт установы заслужана прызнаецца як у Беларусі, так і далёка за яе межамі.

БДУ таксама стаў стартавай пляцоўкай для вялікай колькасці маладых талентаў, навукоўцаў і вынаходнікаў. У ім заўсёды прытрымліваліся прынцыпаў усебаковага развіцця асобы, таму выпускнікоў універсітэта можна знайсці на ўсіх кірунках эканамічнай і сацыяльнай сфер краіны.

Жадаю ўсім Вам, дарагія сябры, далейшых дасягненняў, невычэрпнага натхнення, здароўя і дабрабыту.

Факультэты & інст

У структуру БДУ ўваходзяць больш за дваццаць навучальных установаў, і такую палітру амаль не сустрэнеш у свеце! Прычым усе факультэты ўвесь час эвалюцыянуюць: уводзяць новыя спецыяльнасці і спецыялізацыі, эксперыментуюць з формамі навучання і нават мяняюць назвы. Вось іх візітоўкі.

Інстытут журналістыкі

Найстарэйшы на постсавецкай прасторы журфак БДУ ўмела спалучае ў сабе натхненне і найноўшыя тэхналогіі, творчы парыў і карпатлівую штодзённую працу, моцныя традыцыі і самыя сучасныя трэнды. Вядомыя людзі Беларусі, майстры слова – а гэта журналісты, празаікі, паэты, дзеячы культуры і мастацтва – «родам з журфака». Які яшчэ факультэт можа пахваліцца сваім нобелеўскім лаўрэатам – а наш можа! Галоўны капітал журфака – яго выкладчыкі, і толькі потым – новы сучасны будынак, добра абсталяваныя лабараторыі і студыі. Людзі, якія тут працуюць, не падзяляюць жыццё на прафесійнае і прыватнае, таму выкладаюць натхнёна, сумесна са студэнтамі рэалізуюць шмат разнастайных адукацыйных, культурных, грамадскіх праектаў. А яшчэ ў нас трывалыя сувязі з прафесійнай супольнасцю і працадаўцамі, усе самыя новыя трэнды ўкараняюцца ў навучальны працэс. Аднак самая галоўная асаблівасць журфака ў тым, што тут рэалізуюцца ўсе пачынанні. Інстытут журналістыкі БДУ – гэта месца, дзе юнацтва распраўляе крылы!

Факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі

У аснове навучання спецыялістаў на ФПМІ ляжыць фундаментальная падрыхтоўка, якая забяспечвае разуменне сістэмных працэсаў і ўменне хутка рэагаваць на змены ў сферы інфармацыйных тэхналогій. Адгэтуль асноўны прынцып ФПМІ – навучыць вучыцца.

Пра высокі ўзровень падрыхтоўкі кажуць дасягненні студэнтаў на міжнародных алімпіядах па матэматыцы і праграмаванні. На факультэце сфарміравана сістэма працы са школьнікамі, пачынаючы з 5 класа. Больш за 2,5 тысячы школьнікаў штогод прыцягваюцца да школ юных матэматыкаў і інфарматыкаў, семінараў і розных мерапрыемстваў.

Каля 20 % студэнтаў з'яўляюцца лаўрэатамі спецфонду Прэзідэнта РБ па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў.

Нашы выпускнікі запатрабаваны на рынку працы. Прадпрыемствы Парку высокіх тэхналогій шмат гадоў супрацоўнічаюць з факультэтам і дапамагаюць падрыхтоўцы кадраў.

Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій

Сёння ДІКСТ – адно з самых буйных структурных падраздзяленняў БДУ, якія вядуць падрыхтоўку і перападрыхтоўку спецыялістаў у сферы менеджменту, маркетынгу, сацыяльнай працы, дызайну, права, замежных моў. У яго складзе – сем кафедраў, факультэт павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі, НДЛ сацыялагічных і маркетынгавых даследаванняў «Грамадская думка», цэнтр інфармацыйных тэхналогій, выдавецкі цэнтр, бібліятэка.

Развіццё партнёрскіх сувязяў з замежнымі вышэйшымі навучальнымі і навуковымі ўстановамі – адзін з прыярытэтных кірункаў дзейнасці інстытута. У ДІКСТ функцыянуюць прызнаныя «Навуковая школа мастацтвазнаўства і дызайну» і «Навуковая школа ў галіне сацыяльнай абароны асобаў з абмежаванымі магчымасцямі».

Укараненне ў навучальны працэс інавацыйных адукацыйных тэхналогій, цесная сувязь з прадпрыемствамі і арганізацыямі дазваляе нам максімальна ўлічваць рэальныя запатрабаванні эканомікі і бізнесу і забяспечваць падрыхтоўку добрых спецыялістаў.

Геаграфічны факультэт

Геаграфія як навука не састарэла, таму што географы адказваюць не толькі на пытанне дзе, але і чаму. Аб'ект даследаванняў і ведаў геаграфаў распасціраецца ад зямных нетраў да космасу. Геафак сёння – гэта не толькі рамантыка экспедыцый у цяжкадаступныя раёны, але і мадэляванне геалагічных працэсаў на камп'ютары, апрацоўка касмічных здымкаў, якая дазваляе знаходзіць новыя радовішчы карысных выкапняў (*геалогія і разведка радовішчаў карысных выкапняў*). Укараненне ГІС-тэхналогій спарадзіла гіганцкія струмені інфармацыі і стварыла магчымасці іх выкарыстання па аптымізацыі ўзаемадзеяння прыроды і грамадства (*геаінфармацыйныя сістэмы*). Абвастрэнне праблем узаемадзеяння прыроды і грамадства лішні раз даказвае, што геаэкалагічныя даследаванні павінны мець папераджальны характар (*геаэкалогія*). Змены клімату, якія пачасціліся, неспрыяльныя метэаралагічныя і гідралагічныя з'явы закліканы вырашаць *гідраметэаролагі*. Традыцыйныя метады картаграфавання, складання агульнагеаграфічных і тэматычных карт у наш час істотна змяніліся дзякуючы касмічным спадарожнікам (*космааэракартаграфія*). Глабальны характар дэмаграфічнай праблемы ў нашай краіне абумовіў неабходнасць падрыхтоўкі *геадэмографаў*. Чаму дзесьці растуць непраходныя лясы, а дзесьці бязмежныя ледзяныя пустыні, дзесьці льюць дажджы, а дзесьці не выпадае ні кроплі, дзесьці назіраюцца землятрусы, вывяргаюцца вулканы? Выпускнікі геафака БДУ па-ранейшаму адказваюць і на гэтыя традыцыйныя пытанні (*геаграфія, навукова-педагагічная дзейнасць*).

Біялагічны факультэт

Біяфак – адзін з найстарэйшых у БДУ і ўваходзіць у пяцёрку самых вялікіх факультэтаў: тут навучаецца каля 2200 студэнтаў, 70 магістрантаў і аспірантаў, працуе каля 250 выкладчыкаў і супрацоўнікаў.

Факультэт вядзе падрыхтоўку спецыялістаў па запатрабаваных спецыяльнасцях. Яна спалучаецца з інтэнсіўнай навуковай дзейнасцю. У распараджэнні біяфака маецца грунтоўная база – сучасныя прыборы, абсталяванне, біялагічная станцыя на возеры Нарач, заалагічны музей і батанічны сад. Студэнты праходзяць навучальныя і вытворчыя практыкі на базе навуковых устаноў і прадпрыемстваў краіны, а таксама ў прыродных экасістэмах, у запаведніках і нацыянальных парках.

Студэнцкае жыццё насычана культурнымі і спартыўнымі мерапрыемствамі, прычым такія даўнія традыцыі, як штогадовыя прысвячэнні ў біёлагі і спектаклі ўсімі любімага «біятэатра» дапаўняюцца ў вольны час сучаснымі формамі накшталт конкурсаў «Міс біяфак» і «Містар біяфак». Тут кожны знаходзіць сабе заняткі даспадобы і ніхто не нудзіцца!

Факультэт міжнародных адносін

ФМА дае якасную адукацыю па 6 спецыяльнасцях і 18 спецыялізацыях эканамічнага, прававога, гісторыка-паліталагічнага, лінгвістычнага профілю. На факультэце навучаюцца каля 2500 студэнтаў, у тым ліку каля 500 замежнікаў з 30 краін. У нас выкладаюцца 17 замежных моў. Пашыраецца пералік факультатываў па вывучэнні трэцяй мовы.

Нашы выпускнікі працуюць у Міністэрстве замежных спраў, Дзяржаўным мытным камітэце, практычна ва ўсіх ведамствах краіны, у структурах міжнародных арганізацый. Многія звязалі сваю працоўную кар'еру з рэальным сектарам эканомікі, паспяхова развіваюць уласны бізнес, працягваюць навукова-педагагічную кар'еру.

У верасні 2012 г. ФМА атрымаў у сваё распараджэнне новы сучасны навучальны корпус.

Факультэт філасофіі і сацыяльных навук

Сёння ФФСН – гэта шматгранная творчая дзейнасць вялікага калектыву, які аб'ядноўвае амаль 150 выкладчыкаў і супрацоўнікаў, больш за 1100 студэнтаў і аспірантаў, якія сумесна асвойваюць духоўную спадчыну мінулага і ствараюць новы імідж факультэта як адной з самых прэстыжных інтэлектуальных карпарацый ва ўніверсітэце.

ФФСН з'яўляецца адзіным міждысцыплінарным факультэтам БДУ, які арганічна ўключае ў сябе тры класічныя спецыяльнасці: філасофію, сацыялогію і псіхалогію, а таксама досыць новую, але ўжо папулярную – «сацыяльныя камунікацыі».

Значнымі мерапрыемствамі з'яўляюцца турзлёт ФФСН, дзень першакурсніка, фэст кароткаметражнага кіно «Кальварыйскія бабры», канферэнцыі і семінары з міжнародным статусам, заняткі ў школе юнага філосафа «Пайдэя», ліга маладых выбаршчыкаў і іншыя.

ФФСН з'яўляецца ўнікальным па змесце, бо ў сваёй накіраванасці да вытокаў філасофіі і гуманітарных ведаў, ён разам з тым малады, актыўны і арыентаваны ў будучыню!

Гістарычны факультэт

Гістфак – флагман айчыннай гістарычнай адукацыі. Ён размешчаны ў будынку, які з'яўляўся Домам № 1 БДУ і дзе пачыналася гісторыя ўніверсітэта ў 1921 годзе.

Сярод выкладчыкаў акадэмік і член-карэспандэнт НАН Беларусі, 20 дактароў навук, звыш 80 кандыдатаў навук. Вядзецца падрыхтоўка спецыялістаў па чатырох спецыяльнасцях: гісторыя, гісторыка-архівазнаўства, музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны і дакументазнаўства, а таксама па дзесяці спецыяльнасцях магістратуры. Нашы выпускнікі запатрабаваны ў самых розных прафесіях і сферах дзейнасці дзякуючы класічнай адукацыі ў спалучэнні з інавацыйнымі формамі навучальнай і навуковай працы. Захаванне традыцый і хуткая рэакцыя на змены – адметная асаблівасць факультэта. Навучальны працэс дапаўняе музей з багатымі этнаграфічнай, археалагічнай і нумізматычнай калекцыямі, камп'ютарныя класы і лабараторыі. Гістарычны факультэт дае таксама велізарныя магчымасці для рэалізацыі інтэлектуальных, творчых, спартыўных здольнасцяў студэнтаў.

Факультэт радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій

ФРКТ рыхтуе спецыялістаў у галіне радыёфізікі, электронікі, інфармацыйных і аэракасмічных тэхналогій і адзіны ў Беларусі ажыццяўляе падрыхтоўку ў галіне аэракасмічных радыёэлектронных сістэм і тэхналогій.

Нашы выпускнікі запатрабаваны практычна ва ўсіх галінах навукі і навукаёмістай прамысловасці, вышэйшай школы, ІТ-сферы, банкаўскага сектара, бізнесу. Са сцен факультэта выйшлі вядомыя навукоўцы, кіраўнікі ВНУ, НДІ, навукова-вытворчых аб'яднанняў. Многія з іх паспяхова працуюць у буйных кампаніях па ўсім свеце.

У 2002 г. было створана Беларускае рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне радыёфізікаў з выпускнікоў факультэта, які ў верасні гэтага года адзначыў 40-годдзе заснавання і 55-годдзе падрыхтоўкі радыёфізікаў у БДУ.

ЫТУТЫ

Механіка-матэматычны факультэт

На працягу амаль 59 гадоў мехмат пацвярджае званне аднаго з самых элітных навучальных падраздзяленняў. 11 кафедраў рыхтуюць каля 1500 студэнтаў і магістрантаў – будучых спецыялістаў у галіне матэматыкі, механікі, сістэмнага аналізу і інфармацыйных тэхналогій. Нашы выпускнікі займаюць вядучыя пазіцыі ў сферы навукі і адукацыі, бізнесу, эканомікі і IT. Сярод іх Міхаіл Жураўкоў (міністр адукацыі РБ), Сяргей Чыжык (першы намеснік старшыні прэзідыума НАН Беларусі), Сяргей Абламейка (рэктар БДУ), Аляксандр Машэнскі (гендырэктар СП ТАА «Санта Імпэкс Брэст»), Віктар Бабарыка (старшыня кіравання ААТ «Белгазпрамбанк») і іншыя.

Мехмат падтрымлівае навуковыя кантакты па ўсім свеце; улетку найлепшыя студэнты накіроўваюцца на стажыроўку ва ўніверсітэт Ота-фон-Герыке (Магдэбург, Германія). Нашы студэнты праходзяць практыку з далейшым працаўладкаваннем у вядучых IT-кампаніях, такіх як EPAM Systems, Itransition, HiQo Solutions, IBA Group, Qulix Systems і інш.

Вучыцца на мехмаце цікава і весела: менавіта тут сустракаюцца найвышэйшая якасць адукацыі і актыўнае студэнцкае жыццё!

Філалагічны факультэт

Філфак – гэта вялікі плацдарм для рэалізацыі асобы. Ён нездарма прызнаваўся самым творчым у БДУ. Вучыцца на філфаку сапраўды цікава! Як шматлікія мовы свету аб'ядноўваюцца ў сем'і, так на філфаку абсалютна розныя людзі становяцца самымі блізкімі і роднымі.

У чым наша адметнасць? У тым, што філфак пераняў самыя лепшыя рысы беларускага народа. Ён славіцца сваёй гасціннасцю, у чым могуць пераканацца ўдзельнікі нашай патрыятычна-асветніцкай акцыі «Вязынка», да якой далучаецца ўвесь універсітэт. Філфак – збіральнік найвыбітнейшых скарбаў беларускай культуры і літаратуры. Мы шануем родную мову і з вялікай павагай ставімся да моў іншых народаў свету. Філфак вучыць быць сапраўдным сябрам. Самыя прыгожыя ў свеце дзяўчаты жывуць у Беларусі, а самыя прыгожыя беларусачкі вучацца у нас на філфаку.

Філалагічны факультэт жыве пад дэвізам: роднае варта берагчы.

Хімічны факультэт

Хімфак – гэта ўнікальны цэнтр адукацыі, навукі і інавацый, які склаўся за кошт існавання пад адным дахам па вул. Ленінградская, 14 самога факультэта і НДІ фізіка-хімічных праблем, вядучай навуковай установы РБ. Тут навучаецца 830 студэнтаў па такіх унікальных для РБ спецыяльнасцях, як фундаментальная хімія, хімія высокіх энергій, хімія лекавых злучэнняў. Важная перавага нашых выпускнікоў – двайная кваліфікацыя, напрыклад: «Хімік. Даследчык», «Хімік. Радыяцыйны хімік. Радыяхімік», «Хімік. Біяфармахімік». Прычым апошнюю немагчыма набыць нідзе ў свеце, акрамя як на хімфаку.

Навучаюць студэнтаў 120 прафесіяналаў высокага ўзроўню. Нямногія студэнты БДУ могуць ганарыцца тым, што з імі займаюцца 2 акадэмікі, 2 члены-карэспандэнты НАН Беларусі, 26 прафесараў і 80 кандыдатаў навук. Да паслуг студэнтаў самыя перадавыя адукацыйныя тэхналогіі: лекцыйны падкастынг, платформа MOODLE для дыстанцыйнага навучання, відэалабараторныя працы, анлайн-лекцыі і стажыроўкі ў навукова-адукацыйных цэнтрах Расіі і Францыі.

Інстытут бізнесу і менеджменту тэхналогій

ІБМТ з'яўляецца адзінай у Беларусі ўстановай вышэйшай адукацыі, якая рэалізуе англамоўныя адукацыйныя праекты – магістарскую праграму MBA і падрыхтоўку па спецыяльнасці «бізнес-адміністраванне».

Мы ажыццяўляем унікальныя праекты з бізнес-школамі і ўніверсітэтамі Германіі, Нарвегіі, Нідэрландаў, ЗША, Польшчы, Фінляндыі, Літвы і іншых краін.

Інстытут адпавядае ў навучанні найлепшым айчынным і замежным стандартам, укараняе інтэрактыўныя, эўрыстычныя і праекцыйныя метады навучання, інфармацыйна-камунікацыйныя і дыстанцыйныя тэхналогіі ў адукацыі.

ІБМТ прапануе ўсе ўзроўні адукацыі: ад першага вышэйшага да дадатковага для дарослых. Студэнты набіраюцца досведу кіраўніцтва і стварэння бізнесу ўжо падчас вучобы.

У інстытута больш за 30 дзейных адукацыйных праграм па розных кірунках бізнес-кіравання і звыш 12 000 выпускнікоў.

Міжнародны дзяржаўны экалагічны інстытут імя А. Д. Сахарава

МДЭІ імя А. Д. Сахарава – вядучая ўстанова адукацыі ў Беларусі і СНД па падрыхтоўцы спецыялістаў экалагічнага профілю, супрацоўнічае з ЮНЕСКА, ПРААН, ДААД, офісам Еўрасаюза ў Мінску, вядучымі беларускімі і адукацыйнымі цэнтрамі іншых краін. Студэнты, магістранты і аспіранты інстытута ўдзельнічаюць у міжнародных даследчых праектах, стажыруюцца ў замежных універсітэтах. Візітнай карткай інстытута сталі міжнародная навуковая канферэнцыя «Сахараўскія чытанні: экалагічныя праблемы XXI стагоддзя» і канферэнцыя маладых навукоўцаў, аспірантаў, магістрантаў і студэнтаў Actual Environmental Problems.

Юрыдычны факультэт

На працягу сваёй гісторыі юрфак ажыццяўляў падрыхтоўку кадраў для дзяржаўных органаў. Нашы выпускнікі робяць значны ўнёсак у развіццё ўсіх сфер грамадства. Сёння яны ўзначальваюць Канстытуцыйны (П. П. Міклашэвіч) і Вярхоўны (В. А. Сукала) суды, Генеральную пракуратуру (А. У. Канюк), Адміністрацыю Прэзідэнта РБ (В. В. Міцкевіч, намеснік кіраўніка), Суд Еўразійскага эканамічнага саюза (А. А. Федарцоў), Эканамічны суд СНД (Л. Э. Камянкова), Рэспубліканскую калегію адвакатаў (В. І. Чайчыц), Саюз пісьменнікаў Беларусі (М. І. Чаргінец) і інш.

Больш за 3220 студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў, у тым ліку 128 замежных студэнтаў, навучаюцца па 3 спецыяльнасцях: «правазнаўства»; «эканамічнае права»; «паліталогія».

Шмат навучэнцаў уключаны ў спецфонды Прэзідэнта РБ. На юрфаку вучыцца больш за 20 майстроў спорту, якія перамагалі на міжнародных спартыўных спаборніцтвах.

Дыплом юрфака БДУ – гэта гарантыя паспяховай кар'еры і самарэалізацыі!

Фізічны факультэт

Фізфак прапануе навучанне па найбольш перспектыўных спецыяльнасцях і спецыялізацыях: камп'ютарная фізіка, фізічная інфарматыка, фізіка нанаматэрыялаў і нанатэхналогій, ядзерныя фізіка і тэхналогіі, энергафізіка, біяфізіка, лазерная фізіка і інш. У рамках спецыяльнасці «ядзерныя фізіка і тэхналогіі» рыхтуюцца спецыялісты для БелАЭС. Веданне англійскай мовы і моў праграмавання спрыяе таму, што траціна выпускнікоў штогод размяркоўваецца ў кампаніі IT-профілю. Нашы выпускнікі складаюць вялікую частку калектываў фізічных інстытутаў НАН Беларусі.

Асаблівасцю фізфака з'яўляецца актыўная навуковая дзейнасць. Супрацоўнікамі, аспірантамі і студэнтамі штогод публікуецца звыш 500 навуковых прац, у тым ліку больш за 300 артыкулаў! Супрацоўнікі і студэнты стажыруюцца ва ўніверсітэтах Расіі, Польшчы, Германіі і Францыі. Нядаўна падпісана дамова з Далянскім універсітэтам (Кітай).

Эканамічны факультэт

Эканамістаў сталі рыхтаваць з першага дня стварэння БДУ. У 1925 г. дыплом БДУ № 1 атрымаў менавіта эканаміст У. М. Каракулька.

Факультэт рыхтуе кадры для рынкавай эканомікі Беларусі і цалкам апраўдаў сваю канцэпцыю «элітарнага факультэта для эліты». На дзвюх ступенях дзённай формы навучаецца 1200 студэнтаў і яшчэ 850 на завочнай форме. Вучацца 280 замежных студэнтаў з больш як 20 краін.

Галоўны лозунг факультэта: «Мы разумных робім багатымі, а багатых разумнымі».

Факультэт сацыякультурных камунікацый

Палітра спецыяльнасцяў на ФСК настолькі разнастайная, што на першы погляд здаецца: гэта хаатычны набор запатрабаваных сучасным рынкам працы спецыяльнасцяў. Насамрэч гэта лагічна выбудаваны комплекс. Дызайнер без выдатных ведаў інфармацыйных тэхналогій – дылетант. Таксама пры навучанні спецыялістаў па распрацоўцы і прасоўванні сайтаў і рэкламы немагчыма без мастацкай падрыхтоўкі. І ўсё гэта падтрымліваецца магчымасцю вывучэння замежных моў на трох нашых кафедрах. Творчы падыход, інфармацыйныя тэхналогіі, выдатнае веданне замежных моў і праектнае мысленне – наш погляд у будучыню.

Ваенны факультэт

Створаны ў 2003 годзе на базе ваеннай кафедры. Дасведчаныя афіцэры і прафесарска-выкладчыцкі склад рыхтуюць не толькі будучых кадравых афіцэраў, але і студэнтаў універсітэта па праграмах падрыхтоўкі афіцэраў запасу і малодшых камандзіраў.

Пасля навучання маладых лейтэнантаў чакаюць камандзірскія пасады ў вайсковых частках і злучэннях Міністэрства абароны Беларусі.

Інстытут тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірыла

Інстытут тэалогіі створаны 8 верасня 2004 г. пры ўдзеле Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта. З 2015 года яго ўзначальвае Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі.

Студэнты маюць магчымасць стажыравацца на тэалагічных факультэтах вядучых еўрапейскіх універсітэтаў Рыма, Лондана, Парыжа, Вены, Берліна, Гётынгена, Цюбінгена, Рэгенсбурга. Пасля першай ступені адукацыі яны могуць працягнуць навучанне ў магістратуры па спецыяльнасці «рэлігіязнаўства, філасофская антрапалогія, філасофія культуры».

Факультэт даўніверсітэцкай адукацыі

У 1961 годзе на ФДА прыехалі першыя замежныя студэнты – 61 кубінец. Праз 55 гадоў штогод больш за 200 замежных слухачоў з 50 краін заканчваюць праграмы даўніверсітэцкай падрыхтоўкі, сотні замежных грамадзян праходзяць навучанне на курсах рускай мовы, у летняй школе рускай мовы. Тысячы беларускіх дзяцей паспахова займаюцца ў навучальных цэнтрах даўніверсітэцкай падрыхтоўкі, на падрыхтоўчым аддзяленні, бяруць удзел у рэпетыцыйным тэсціраванні. Вялікую цікавасць выклікаюць у беларускіх і замежных студэнтаў лінгвакраіназнаўчыя мерапрыемствы. Замежныя студэнты з задавальненнем спяваюць і чытаюць вершы па-руску, па-руску ж распавядаюць пра свае краіны і традыцыі.

Камертон грамадскай думкі

Прафесарскі сход БДУ – уплывовая грамадская арганізацыя ва ўніверсітэце, бо ў яе складзе 319 дактароў навук, што складае амаль палову ўсіх дактароў навук і прафесараў, якія працуюць у навуковых і адукацыйных цэнтрах нашай краіны.

Гэта сапраўды вельмі важная і значная частка калектыву ўніверсітэта, якая валодае ўнікальнымі кампетэнцыямі, высокім прафесійным патэнцыялам і безумоўным маральным аўтарытэтам.

Напярэдадні 95-годдзя альма-матар варта ўзгадаць, што не толькі гістарычнае мінулае і сучаснае жыццё БДУ, але ў велізарнай ступені і яго будучыня – вынік самаадданай і высокапрафесійнай працы прафесуры ўніверсітэта.

Уплываць праз аўтарытэт

У 2012 г. наш універсітэт адным з першых сярод ВНУ ініцыяваў стварэнне новага грамадскага аб'яднання, якое складаецца з найбольш вопытных і аўтарытэтных яго супрацоўнікаў, што маюць ступень доктара навук або вучонае званне прафесара. Асноўнай мэтай дзейнасці прафесарскага сходу БДУ з'яўляецца кансалідацыя ўсяго калектыву ўніверсітэта для паспяховай рэалізацыі найважнейшых праграм яго развіцця, павышэння якасці адукацыі і навуковых даследаванняў.

Кіраўніцтва прафесарскім сходам ажыццяўляе прэзідыум, што выбіраецца на тры гады з ліку членаў арганізацыі, якія не займаюць адміністрацыйныя пасады ў рэктарате ўніверсітэта. Першы склад прэзідыума паспяхова ўзначальваў акадэмік Анатоль Лесніковіч. 12 сакавіка 2015 г. на агульным пасяджэнні прафесарскага сходу быў абраны новы прэзідыум на чале з загадчыкам кафедры філасофіі і метадалогіі навукі прафесарам ***Анатолем Зелянковым***.

Больш за паўтара года мы працуем у новым складзе прэзідыума, у які ўваходзяць дзевяць прафесараў з розных факультэтаў і навукова-даследчых інстытутаў БДУ. У найбліжэйшай перспектыве наш склад папоўніць прадстаўнік ад калектыву прафесараў МДЭІ імя А. Д. Сахарава.

За дадзены перыяд мы стараліся, зыходзячы з прынцыпу пераемнасці, прытрымлівацца ў нашай дзейнасці тых стратэгічных мэт, якія былі вызначаныя папярэднім складам прэзідыума – гэта: пошук рэзерваў павышэння якасці ўніверсітэцкай адукацыі і недапушчэння нават адноснай дэвальвацыі дыплома БДУ; удасканаленне і аптымізацыя тэхналогій кіравання БДУ і кіраўніцкай структуры ў БДУ; фарміраванне і развіццё сучаснай інфраструктуры навуковых даследаванняў ва ўніверсітэце і захаванне яго навуковага патэнцыялу; сацыяльная абарона прафесарска-выкладчыцкага складу БДУ і іншыя.

Галосна абмяркоўваць

Мы таксама спрабуем шукаць новыя формы і метады працы, аператыўна рэагаваць на сучасныя выклікі і праблемы. Сярод іх можна адзначыць: беспрэцэдэнтную камерцыялізацыю вышэйшай адукацыі, зніжэнне ўзроўню падрыхтоўкі студэнтаў-платнікаў; працяглую тэндэнцыю бюракратызацыі і празмернай цэнтралізацыі адукацыйнай сферы; прыкметнае зніжэнне сацыяльнага статусу і папулярнасці навуковага работніка і выкладчыка вышэйшай школы; ну і, вядома ж, пастаяннае недафінансаванне ўсёй сістэмы вышэйшай адукацыі, а таксама відавочна неадэкватную аплату працы яе работнікаў, недасканалае іх пенсійнае забеспячэнне.

Зразумела, што пералічаныя праблемы не з'яўляюцца толькі ўніверсітэцкімі, а хутчэй характарызуюць усю сістэму вышэйшай адукацыі.

Канешне, прафесарскі сход – гэта не структура выканаўчай улады. У яго няма адпаведных рэсурсаў і кампетэнцый. Гэта своеасаблівы інстытут грамадзянскай супольнасці ў нашым ўніверсітэце, і яго задача не столькі вырашаць праблемы, колькі публічна і пераканаўча інфармаваць кіраўніцтва ВНУ, і ў першую чаргу яго рэктара, пра найбольш актуальныя пытанні ўніверсітэцкага жыцця і перспектыўныя напрамкі пошуку адказаў, якіх чакае ад кіраўніцтва не толькі прафесарская супольнасць, але і ўвесь універсітэцкі калектыў.

Трымаць руку на пульсе

Таму нам было важна, як кажуць, трымаць руку на пульсе і ў рэжыме пастаяннага маніторынгу арганізоўваць зносіны з членамі прафесарскага сходу з тым, каб чуць іх меркаванні, рэагаваць на іх прапановы. За мінулы перыяд мы правялі сустрэчы з прафесарска-выкладчыцкім складам шасці факультэтаў БДУ (фізічным, механіка-матэматычным, філалагічным, гістарычным, эканамічным і ФПМІ). У бягучым навучальным годзе плануем працягнуць дадзеную працу і зладзіць сустрэчы з прафесарамі і кіраўніцтвам геафака, біяфака, ФМА і ФРКТ.

Дарэчы, 3 лістапада 2015 г. па ініцыятыве прафесарскага сходу была арганізавана сустрэча са Старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу РБ прафесарам *Міхаілам Мясніковічам*. У сваёй лекцыі перад больш чым 250 прафесарамі БДУ Міхаіл Уладзіміравіч расказаў пра найбольш складаныя і актуальныя працэсы развіцця навукова-адукацыйнага комплексу нашай краіны, сістэмна ахарактарызаваў інавацыйную стратэгію Беларусі ў сучасных умовах глабальных і рэгіянальных выклікаў, пазначыў перспектывы ўваходжання Беларусі ў розныя інтэграцыйныя праекты і аб'яднанні. У цэлым гэтая сустрэча аказалася вельмі цікавай і, па-мойму, узаемна карыснай. Яна ў чарговы раз прадэманстравала ісціну, што сустрэчы вышэйшага кіраўніцтва краіны з калектывам студэнтаў і прафесараў універсітэта – гэта не толькі даніна заходнім традыцыям, але і цалкам сучасны і перспектыўны трэнд для беларускай палітычнай эліты. Прынамсі, мы таксама плануем арганізаваць сустрэчу аднаго з кіраўнікоў нова-абранага парламента Беларусі з калектывам прафесараў нашага ўніверсітэта.

Узаемадзейнічаць з рэктарам

Вядома, што ў арганізацыі падобных сустрэч вялікую дапамогу нам аказвае рэктар універсітэта, дзякуючы свайму аўтарытэту і ўплыву. І наогул, прэзідыум прафесарскага сходу выказвае сваю шчырую падзяку рэктарату БДУ і асабліва рэктару акадэміку Сяргею Абламейку за разуменне і пастаянную падтрымку ўсіх нашых прапаноў. Увесь час мы працуем у рэжыме канструктыўнага дыялогу з Сяргеем Уладзіміравічам, і, як правіла, гэта сапраўды прафесарскі дыялог. Такая атмасфера супрацоўніцтва і прадуктыўнай зваротнай сувязі дазволіла нам выступіць з афіцыйным зваротам да рэктара, у якім мы рэзюмавалі меркаванні прафесарскага сходу БДУ па найбольш актуальных праблемах і магчымых напрамках развіцця ўніверсітэта ў сучасных няпростых умовах.

Гэты наш зварот быў успрыняты рэктарам з поўнай адказнасцю. Ён распарадзіўся пазнаёміць усіх прарэктараў з яго зместам і ў сваім дакладзе на агульным сходзе прафесараў універсітэта 24 сакавіка 2016 г. адказаў на многія пытанні, пастаўленыя ў гэтым звароце, і пракаментаваў вострыя праблемы. Больш за тое, выступаючы 29 верасня на пашыраным пасяджэнні Савета БДУ, рэктар паведаміў пра здзейсненую аптымізацыю Галоўнага ўпраўлення навукі ў адказ на адну з нашых настойлівых прапаноў.

Рэгулярна дыскутаваць

Яшчэ адным важным напрамкам у дзейнасці прафесарскага сходу БДУ з'яўляецца рэгулярнае правядзенне пасяджэнняў навукова-метадалагічнага семінара «Актуальныя праблемы развіцця навукі, адукацыі, культуры», які распачаўся ў кастрычніку 2013 г. Ля вытокаў гэтай цікавай ініцыятывы стаяў тагачасны першы прарэктар БДУ Міхаіл Журавкоў. Дагэтуль з грунтоўнымі дакладамі выступілі прафесары: Пётр Брыгадзін, Васіль Стражаў, Анатоль Зелянкоў, Віктар Гайсёнак, Анатоль Макараў і іншыя.

Такім чынам, прафесарскі сход сапраўды выконвае важныя функцыі, з'яўляючыся своеасаблівым камертонам грамадскай думкі ўсёй універсітэцкай супольнасці. Ён спрыяе захаванню БДУ вядучага статусу сярод ВНУ нашай краіны і забеспячэнню яму годнага месца ў сусветнай навукова-адукацыйнай прасторы.

Анатоль ЗЕЛЯНКОЎ,
старшыня прэзідыума
Прафесарскага сходу БДУ

Словам і справай

ГА «Саюз жанчын БДУ» існуе ўжо амаль 17 гадоў. Арганізацыя створана для сацыяльнай падтрымкі, абароны правоў і інтарэсаў жанчын, якія працуюць ці навучаюцца ў БДУ.

За гэтыя гады было зроблена нямала. Сёння ў арганізацыі амаль 500 чалавек, сярод якіх дактары навук, прафесары, дацэнты, кандыдаты навук, выкладчыкі, начальнікі структурных падраздзяленняў, супрацоўнікі БДУ. Нядаўна было створана студэнцкае падраздзяленне арганізацыі.

З чэрвеня 2015 года савет арганізацыі працуе ў новым складзе. Новае кіраўніцтва імкнецца захаваць найлепшыя традыцыі Саюза жанчын, закладзеныя тымі, хто стаяў ля вытокаў. Дынамічна развіваюцца асноўныя кірункі дзейнасці: сацыяльны, асветніцкі, навуковы, выдавецкі, пашыраюцца міжнародныя кантакты. Новы дэвіз Саюза жанчын БДУ – «Словам і справай». І гэта сапраўды так. У арганізацыі працуюць неабыякавыя людзі, заўсёды гатовыя прыйсці на дапамогу і словам, і справай, якія займаюць актыўную жыццёвую пазіцыю, адгукаюцца на ўсе падзеі ў нашай краіне, шмат робяць для захавання пазітыўнага іміджу нашага ўніверсітэта як у Беларусі, так і на міжнароднай арэне. Вялікую ролю для БДУ іграе ў працы арганізацыі развіццё выхаваўчага складніка, папулярызацыя дзейнасці жанчын-навукоўцаў, жанчын-лідараў; спрыянне ўмацаванню сям'і і яе аўтарытэту ў грамадстве, павышэнню ролі жанчыны ў грамадскім і сацыяльна-культурным жыцці. Саюз жанчын супрацоўнічае з рэктаратам, першаснай арганізацыяй РГА «Белая Русь», дэканатамі і іншымі структурамі БДУ.

Саюз жанчын сумесна з Фундаментальнай бібліятэкай БДУ і пры падтрымцы рэктарата стаў заснавальнікам адзінага ў краіне электроннага навукова-асветніцкага часопіса «Сафія». Самымі цікавымі праектамі Саюза жанчын БДУ за апошні год сталі: «Мая Радзіма Беларусь. Універсітэт у кантэксце дасягненняў»; «Мая краіна – мая будучыня. Важнасць усвядомленага выбару»; «Жанчыны свету супраць вайны і агрэсіі»; «Жанчыны-навукоўцы БДУ»; «Высокі подзвіг мацярынства» (падтрымка шматдзетных сем'яў); «Мы дорым вам цяпло нашых сэрцаў» (патранаж студэнтаў, пазбаўленых бацькоўскай апекі), «Вывучэнне гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі» (сумесна з пярвічнай арганізацыяй БДУ РГА «Белая Русь»). У гэтым юбілейным годзе саюз жанчын выступіў з ініцыятывай новага праекта, падтрыманага рэктаратам, – правядзенне конкурсу «Жанчына года БДУ» ў 5 намінацыях (сайт арганізацыі *www.unionwomen.bsu.by*)

Ірына КАЗАКОВА,
старшыня Саюза жанчын БДУ

Калі сям'я дома

«Главней всего – погода в доме», – спяваецца ў шлягеры. Для многіх студэнтаў БДУ такім домам стаў Студэнцкі гарадок. У нашым інтэрв'ю галоўны метэаролаг (і па сумяшчальніцтве дырэктар студгарадка) **Ала МЕЛЕХ** распавяла, як спрыяльны клімат у інтэрнатах уплывае на поспехі студэнтаў у навучальнай дзейнасці.

– Ала Уладзіміраўна, першы інтэрнат БДУ прыняў сваіх жыхароў у 1952 годзе. Як змянілася сітуацыя за апошнія гады?

– У студэнцкім гарадку налічваецца 10 інтэрнатаў. Дзевяць з іх прызначаны для студэнтаў, і ў адным пражываюць супрацоўнікі ўніверсітэта. З агульнай колькасці чатыры інтэрнаты – кватэрнага, чатыры – блокавага і два – калідорнага тыпу. Усе інтэрнаты адраманта-ваны і увесь час удасканальваюцца. Дарэчы, першы інтэрнат, які адкрыўся (№ 1), некалі быў інтэрнатам калідорнага тыпу, а стаў – кватэрнага. У студзені 2015 года пасля капітальнага рамонту адкрыўся інтэрнат № 3. Мы імкнёмся ствараць для студэнтаў максімальна камфортныя ўмовы: кухня, халадзільнікі, сучасная мэбля...

– Так, сапраўды. У інтэрнаце можна адчуць сябе як дома. Скажыце, калі ласка, а ці шмат хто мае патрэбу ў інтэрнаце?

– Троху простай матэматыкі – і можна заўважыць, што адсотак забяспечанасці студэнтаў інтэрнатам значна вырас. Калі ў 2011/2012 навуч. годзе засялялася не больш за 47 % ад тых, хто меў патрэбу, то на пачатку 2016/2017 навуч. года дадзеная лічба перавышае 75 %. Гэта стала магчымым дзякуючы розным фактарам: увядзенню ў эксплуатацыю новых інтэрнатаў у Студэнцкай вёсцы, капітальнаму рамонту некаторых інтэрнатаў. Без шкоды для камфорту была павялічана колькасць жыхароў на адзін пакой у інтэрнатах № 5 і 10. Звярнуўшыся да «ўшчыльнення», мы змаглі забяспечыць інтэрнатам амаль на 700 студэнтаў больш, а такую колькасць можна параўнаць з цэлым інтэрнатам. Хацелася б адзначыць, што ў найбліжэйшай будучыні дадзены адсотак можа павялічыцца з-за пераўтварэння пяцігадовай праграмы навучання ў чатырохгадовую і здвоенага выпуску ў 2016/2017 навуч. годзе.

– Яшчэ адно пытанне пра лічбы. З чым звязаны той факт, што, пачынаючы з мінулага навучальнага года, павялічыўся адсотак забяспечанасці месцамі ў інтэрнатах першакурснікаў: 85 % – для гуманітарных факультэтаў, 100% – для прыродазнаўчых?

– Перавага для першакурснікаў, вядома, не выпадковая. Іншагароднім значна лягчэй адаптоўвацца да новых умоў жыцця, пражываючы ў інтэрнаце. Акрамя таго, прапанова інтэрната з'яўляецца канкурэнтнай перавагай універсітэта пры прыёме абітурыентаў. Так імкнёмся прыцягнуць у alma mater найлепшых з лепшых.

– У нашым універсітэце навучаецца вялікая колькасць студэнтаў з іншых краін. Як атрымліваецца палегчыць адаптацыю замежных грамадзян у рамках інтэрнатаў? І ці ўсе замежныя студэнты маюць магчымасць засяліцца ў інтэрнат?

– У студгарадку створаны сацыяльна-педагагічны цэнтр, дзе працуюць прафесіяналы. З улікам спецыфікі той ці іншай краіны нашы спецыялісты знаходзяць індывідуальны падыход да кожнага замежнага грамадзяніна. Калі казаць мовай эканомікі, то такія студэнты атрымліваюць «сэрвіс ад дзвярэй да дзвярэй», гэта значыць з моманту размяшчэння ў інтэрнаце да самага выпускнога. Гутаркі, сустрэчы, розныя мерапрыемствы – асноўныя фактары паспяховай адаптацыі. Што да засялення, то практычна ўсе замежныя студэнты забяспечаны месцамі ў інтэрнаце. Выключэнне складаюць тыя навучэнцы, да якіх былі ўжыты дысцыплінарныя захады (вымова ці вымова з хадайніцтвам пра скасаванне дамовы наймання жылога памяшкання).

– У шмат каго існуе стэрэатып, што ў інтэрнат студэнт прыходзіць паесці і пераначаваць. А якія яшчэ «магчымасці» даюць сваім жыхарам інтэрнаты БДУ?

– Калі казаць пра «паесці», то варта адзначыць, што побач з кожным інтэрнатам або ў яго сценах ёсць ці сталовая, ці кафэ, ці буфет. Акрамя таго, калі камусьці нязручна вучыцца ў сябе ў пакоі, можна падрыхтавацца да заняткаў у пакоі самападрыхтоўкі. Інтэрнат не проста дом, бо не ва ўсіх дома ёсць магчымасць заняцца спортам у трэнажорнай зале, пагуляць у настольны тэніс ці більярд, а ў жыхароў студэнцкага гарадка гэта магчымасць знаходзіцца амаль у суседнім пакоі. Таксама варта адзначыць, што на базе нашых інтэрнатаў працуюць пральні, цырульні, майстэрні па рамонце абутку, майстэрня па рамонце адзення, кавярня, міні-крамы. А ў інтэрнаце № 3 ёсць нават веласіпедны пакой.

– Выдатна! Такія ўмовы, упэўнена, спрыяльныя для самаадукацыі, самаразвіцця...

– І самарэалізацыі. Мы імкнёмся зрабіць знаходжанне студэнтаў у інтэрнаце максімальна прадуктыўным, таму для іх адкрыты спартыўныя секцыі і гурткі. Не знайшлі заняткаў даспадобы? Калі ёсць жаданне адкрыць сваю секцыю, то ў нас заўсёды знойдуцца магчымасці для адкрыцця секцыі ці гуртка па ініцыятыве студэнта! Дарэчы, пра ініцыятыву: хацелася б асабліва вылучыць самых актыўных жыхароў інтэрнатаў. Для такіх ёсць магчымасць стаць сябрам студэнцкага савета, грамадскай інфармацыйнай службы, творчай лабараторыі, спартыўна-турысцкага клуба, студэнцкай службы бяспекі, якія разам аб'ядноўвае каардынацыйны савет Студэнцкага гарадка БДУ. Гэтыя арганізацыі сталі сапраўдным студэнцкім братэрствам, якое дапамагае рабіць жыццё ў інтэрнаце значна ярчэйшым. Прычым актывісты паспяваюць не толькі праводзіць мерапрыемствы, прадстаўляць інтарэсы жыхароў інтэрната ці забяспечваць парадак, але і добра вучыцца. Хачу сказаць велізарнае дзякуй нашым актывістам за іх працу, ініцыятыву і адданасць справе.

– Органы самакіравання, педагагічны склад, жыхары – усе адна вялікая і шчаслівая сям'я. Аднак, як пісаў класік, «кожная сям'я нешчаслівая па-свойму». Ці ёсць нейкія складанасці?

– Хутчэй, не складанасці, а пакуль не рэалізаваныя планы. Напрыклад, хацелася б адчыніць пральню ў інтэрнаце № 3, а знайсці спонсара вельмі складана. Плануем таксама замену мэблі ў «капейцы», вокнаў у шостым інтэрнаце, спадзяёмся правесці мадэрнізацыю фасада ў інтэрнаце № 10. На жаль, пакуль няма фінансавых магчымасцяў. Сапраўды, студэнцкі гарадок – сям'я, а разам з сям'ёй любыя складанасці пад сілу.

– І напрыканцы, Вашы пажаданні да 95-годдзя БДУ.

– Юбілей – свята і студэнтаў і выкладчыкаў, усіх тых, хто носіць высокае званне «супрацоўнік БДУ». Таму самае галоўнае пажаданне – мець шмат сіл, якія кожны дзень будуць натхняць нас на ўслаўленне светлага імя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Універсітэту ў цэлым таксама жадаю яшчэ больш светлых розумаў, творчых студэнтаў і таленавітых выпускнікоў!

Гутарыла
Ганна РЫБАЦКАЯ

Бібліятэка як феномен культуры

Разам з БДУ свой 95-гадовы юбілей адзначае Фундаментальная бібліятэка. Адным з асноўных святочных мерапрыемстваў стала 16-я Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Менеджмент універсітэцкіх бібліятэк», якая прайшла ў рамках IV Міжнароднага кангрэса «Бібліятэка як феномен культуры».

Міжнародная канферэнцыя «Менеджмент універсітэцкіх бібліятэк»

Невыпадкова было прынята рашэнне аб'яднаць мерапрыемствы дзвюх найбуйнейшых бібліятэк краіны – ФБ БДУ і Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (НББ) у адзіны форум, паколькі першыя гады існавання гэтых дзвюх бібліятэк непарыўна звязаны: з 1922 па 1926 гг. у БДУ дзейнічала адзіная дзяржаўная і ўніверсітэцкая бібліятэка.

У канферэнцыі прынялі ўдзел 202 чалавекі, з іх 45 прадстаўнікоў з 10 замежных краін. Гэта кіраўнікі і спецыялісты бібліятэк, установ вышэйшай адукацыі і навукі, цэнтраў і выдавецтваў, вытворцы і пастаўшчыкі навуковай інфармацыі з Расіі, Беларусі, ЗША, Францыі, Германіі, Польшчы, Украіны, Казахстана, Малдовы, ААЭ, Нігерыі. Першы дзень канферэнцыі прайшоў у фармаце «ALL LibSTARS», на якой вядучыя замежныя спецыялісты і эксперты ў галіне бібліятэчнай справы прадставілі праекты, якія спрыяюць развіццю бібліятэк у сучасным навукова-адукацыйным асяроддзі і глабальнай інфармацыйнай прасторы.

Юбілейная канферэнцыя ФБ БДУ – гэта не толькі сустрэча з калегамі, але і магчымасць паказаць дасягненні бібліятэкі, яе ролю ва ўніверсітэце. Бачанне будучыні ўніверсітэцкай бібліятэкі выказаў у сваім выступленні на міжнародным кангрэсе дырэктар ФБ БДУ У. Г. Кулажанка, на секцыях прагучалі даклады супрацоўнікаў бібліятэкі, якія раскрываюць сацыяльна-культурную дзейнасць бібліятэкі. У аснове працы па рэалізацыі ініцыятыў, інтарэсаў, талентаў творчай, крэатыўнай моладзі ляжаць розныя формы: творчыя майстэрні, конкурсы, дыскусійныя пляцоўкі, клубы па інтарэсах і інш. Госці канферэнцыі паўдзельнічалі ў пасяджэннях студэнцкіх клубаў ФБ: кінаклуба «Фруза» і клуба аматараў мастацкага слова «КЛУмБа». За два гады існавання «КЛУмБа» дамаглася значных поспехаў. Клуб узнагароджаны дыпломам 1-й ступені ў намінацыі «Публіцыстыка» і дыпломам 1-й ступені ў намінацыі «Паэзія» рэспубліканскага конкурсу літаратурнай творчасці студэнтаў «Аўтограф», рэспубліканскага фэсту мастацкай творчасці студэнцкай моладзі «АРТ-вакацыі–2016». «КЛУмБа» стала стартавай пляцоўкай для пачаткоўцаў празаікаў і паэтаў, месцам для дыскусій і сустрэч студэнтаў усіх факультэтаў БДУ з вядомымі пісьменнікамі і творчымі людзьмі. У рамках канферэнцыі адбылася прэзентацыя літаратурнага зборніка «Кветкавыя ветразі», выдадзенага да 95-гадовага юбілею БДУ і ФБ.

З дасягненнямі ФБ БДУ ў галіне аўтаматызаваных інфармацыйных тэхналогій азнаёміліся ўдзельнікі канферэнцыі і кангрэса на выставе выдавецкай прадукцыі, электронных інфармацыйных рэсурсаў і сэрвісаў у НББ. Супрацоўнікі ФБ дэманстравалі электронную бібліятэку БДУ, якая змяшчае каля 100 тыс. дакументаў. Паводле міжнародных рэйтынгаў, ЭБ БДУ займае вядучыя месцы сярод інстытуцыянальных рэпазітарыяў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Акрамя таго на выставе дэманстравалася ўкаранёная ў 2015 г. новая канцэпцыя сайта ФБ БДУ, які заняў 1 месца ў намінацыі «Найлепшы сайт структурнага падраздзялення БДУ»; паказаны вынікі працы цэнтра навуковай творчасці студэнтаў, абсталяванага 3D-прынтарам.

На выставе «Фундаментальная бібліятэка БДУ: 95 гадоў на службе ўніверсітэцкай адукацыі Беларусі» былі прадстаўлены экспанаты, якія ўзнаўляюць асноўныя старонкі гісторыі ФБ БДУ і сучасныя яе дасягненні. Аснову экспазіцыі склалі выданні з фонду ФБ БДУ і НББ, набытыя для бібліятэкі ў гады іх сумеснай дзейнасці; навуковыя выданні і манаграфіі з аўтографамі вядомых пісьменнікаў, навукоўцаў, выкладчыкаў, выпускнікоў БДУ. Больш за 40 гадоў ФБ БДУ з'яўляецца метадычным і каардынацыйным цэнтрам сеткі бібліятэк установ вышэйшай адукацыі Беларусі. Гэтаму важнаму кірунку дзейнасці ФБ таксама прысвечана частка выставы.

Дзейнасць ФБ непарыўна звязана з дзейнасцю БДУ. Усе паслугі і інфармацыйныя рэсурсы, якія прадстаўляюцца бібліятэкай, накіраваны на задавальненне інфармацыйных, адукацыйных, навуковых запатрабаванняў студэнтаў, выкладчыкаў, навукоўцаў універсітэта. Для гэтага бібліятэка ўвесь час папаўняе свае фонды, прапануе доступ да значнай для ўніверсітэта інфармацыі з усяго свету, стварае камфортныя ўмовы для працы ў сценах бібліятэкі, праводзіць навучанне сваіх карыстальнікаў з мэтай удасканалення навыкаў пошуку, выкарыстання інфармацыі і прасоўвання навуковых і даследчых прац навукоўцаў БДУ ў сусветнай інфармацыйнай прасторы.

Ала БУЦІНА,
намеснік дырэктара ФБ БДУ

Студэнты святкуюць!

Студэнцкая асамблея БДУ і ўпраўленне выхаваўчай працы з моладдзю падрыхтавалі шмат падарункаў альма-матар да яе 95-га дня нараджэння. Выбар талісмана ўніверсітэта, інста-конкурс і літаратурнае спаборніцтва ў 95 словах, міжнародная канферэнцыя, мюзікл пра гісторыю ВНУ і «ўсяночная» музычная феерыя. Паглядзім, якія падзеі чакаюць у кастрычніку-лістападзе наша студэнцкае братэрства.

Самая шматлікая каманда студэнтаў папрацавала над праектам міжнароднага моладзевага форуму **«Моладзь. Інтэграцыя. Развіццё»,** які адбудзецца з 24 па 29 кастрычніка. Прыбылі студэнцкія каманды з 13 краін. Секцыі, трэнінгі, канферэнцыі, а галоўнае – сустрэчы з прадстаўнікамі дзяржаўнай улады, бізнесу, спорту, культуры. Топ-менеджары, кіраванцы, запрошаныя спікеры з буйных кампаній, якія працуюць у Беларусі і за мяжой, абмяркуюць моладзевае прадпрымальніцтва, валанцёрства, інтэрнэт і сацыяльныя сеткі, удзел студэнтаў у кіраванні ўніверсітэтам, развіццё творчай асобы і механізмы міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы студэнцкага самакіравання.

У нашага ўніверсітэта ёсць афіцыйная эмблема – «папараць-кветка». А зараз увага: ёсць ідэя адшукаць/стварыць/знайсці той знак, якім студэнты БДУ змогуць ганарыцца, як хакейныя і футбольныя каманды ганарацца сваімі талісманамі. Студактыў разумее, што навязаць нешта падобнае немагчыма, яно з'яўляецца з жыцця студэнцкай сям'і. Так, напрыклад, у радыёфізікаў ёсць грак. А што магло б стаць адзіным і аб'ядноўчым, выбіраць трэба разам. Таму з 26 верасня ў сацыяльных сетках стартаваў **конкурс на талісман БДУ**. Любы студэнт можа даслаць сваю ідэю, якім павінен быць гэты неафіцыйны талісман-лагатып. 5–7 найлепшых запусцяць на галасаванне. Калі ты хочаш прапанаваць Студэнцкай асамблеі свой цуд, сачы за навінамі ўніверсітэта ў «Твітары» і «УКантакце». Вынікі арганізатары падвядуць да канца кастрычніка, а імя пераможца будзе абвешчана да Міжнароднага дня студэнта.

Хлеба і відовішчаў! Студэнцкая асамблея & Камбінат грамадскага харчавання БДУ (г. зн. усе буфеты і сталовыя) запусцілі конкурс на найлепшы мастацкі малюнак **«Як я бачу БДУ».** Прымаюцца працы любога фармату да 30 кастрычніка. Аўтарскія палотны з подпісам стваральніка ўпрыгожаць сцены ва ўсіх студэнцкіх сталовых, буфетах і кафэ. Найлепшыя працы па выніках галасавання атрымаюць прызы.

Прафсаюзная арганізацыя студэнтаў БДУ 21 верасня дала старт двум агульнаўніверсітэцкім інтэрнэт-конкурсам: **інстаграм-конкурс «95 фота пра БДУ»** ў 6 намінацыях і – для аматараў сачыняць – літаратурны конкурс паэзіі і прозы «95 знакаў пра БДУ» на платформе «Твітара» ў дзвюх намінацыях. Найлепшыя конкурсныя працы будуць узнагароджаны 27 кастрычніка на закрыцці юбілейных святаў BSU NIGHT, там арганізуюць прыгожую выставу фотапрац і «літсушку».

BSU NIGHT («Ноч БДУ») пачнецца 27 кастрычніка ў 18.30 на базе Falcon Club («Фалкон клаб») на праспекце Пераможцаў, 20. Вялікая моладзевая тусоўка для ўсіх студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў, выпускнікоў і працаўнікоў універсітэта. Плануюцца прэс-канферэнцыі з найлепшымі выпускнікамі БДУ па тэмах: палітыка, культура, шоу-бізнес, спорт. Яшчэ гадзінная прэс-канферэнцыя з хэдлайнерам і сустрэча з кіраўніцтвам. Майстар-класы, шмат зон для розных актыўнасцяў. Святочнай ноччу чакаем запальныя дыджэй-сэты, хэдлайнер – адна з зорак лэйбла Black Star. Кінасеансы будуць бліжэй да раніцы. Скончыцца BSU NIGHT у 5.30 наступнага дня. Асноўная падзея «ночы» – гэта не спевакі і спікеры. Да дня нараджэння зрабілі неардынарную пастаноўку мюзікла пра гісторыю ўніверсітэта з 1921 года і да сёння.

«Школа старастаў» прайшла з 4 па 6 кастрычніка ў «Брыганціне». Гэта ўжо 10-я школа, дзе студэнты-старастаў навучалі працы з групамі, вырашэнню канфліктаў, прамоўніцкаму майстэрству і ўсяму, што ім спатрэбіцца ў адказнай працы лідара навучальнай групы.

Яркі і арыгінальны студэнцкі саюз 10 кастрычніка запусціў праект **«БДУ ў тваім фармаце».** Час для ўдзелу ёсць у кожнага студэнта, бо найлепшыя фота і відэа па розных намінацыях абяруць 1 снежня. На пачатку кастрычніка на факультэтах прайшлі адборачныя «капуснікі», а ўжо 17 лістапада найлепшыя каманды пазмагаюцца на сцэне Ліцэя БДУ ў грандыёзным фінале.

БРСМ БДУ правёў традыцыйны спартыўна-інтэлектуальны конкурс **«Кубак першакурсніка».** Каманды ваявалі ў «Гаі» на пікетах, а таксама памераліся сіламі ў спартыўных і творчых спаборніцтвах. У творчых нумарах дзеці пафантазіравалі пра тое, што будзе з БДУ праз яшчэ 95 гадоў.

20 кастрычніка ініцыятыўная група студэнтаў БРСМ выправілася з праграмным праектам **«Універсітэт – твой крок у будучыню»** ў Воранава Гродзенскай вобласці. Асветніцкая місія накіравана на прафарыентацыю старэйшых школьнікаў. У горадзе і ў раёне студэнты наведалі школы, дзе яны распавялі пра БДУ, прэзентавалі яго факультэты, спецыяльнасці, пахваліліся дасягненнямі і натхнілі школьнікаў на выдатную здачу ЦТ і паступленне.

Савет па якасці адукацыі правёў **нонстоп-анкетаванне першакурснікаў,** спрабуючы дапамагчы пачаткоўцам факультэтаў у адаптацыі. Уварваўшыся з марамі ў доўгачаканую ВНУ, яны не могуць зразумець, кім у далейшым будуць працаваць. Для рашэння гэтай праблемы на факультэтах правялі круглыя сталы, каб усім максімальна зразумела растлумачыць, дзе яны апынуліся і што іх чакае ў найбліжэйшай будучыні.

На хімічным факультэце ўзнік праект **«Школа эксперыментатара»,** дзякуючы якому на працягу двух месяцаў раз у тыдзень праводзіліся выязныя заняткі ў школах і дзіцячых дамах з эксперыментамі і нянуднымі запамінальнымі правіламі тэхнікі бяспекі. Такі праект дапамог стаць другім дыханнем для хімфака, зацікавіць дзяцей хіміяй, школьнікам па магчымасці ліквідаваць прабелы ў ведах, а таксама сабраць будучых абітурыентаў для хімічнага факультэта БДУ.

Упраўленне выхаваўчай працы з моладдзю таксама падрыхтавала некалькі цікавых конкурсаў і акцый, прымеркаваных да дня нараджэння альма-матар. На пачатку кастрычніка быў абвешчаны конкурс на **«найлепшую студэнцкую газету»** з тэмай «БДУ – 95!». У ім узялі ўдзел рэдакцыйныя калектывы студэнцкіх газет факультэтаў, а таксама выданняў грамадскіх арганізацый і органаў студэнцкага самакіравання. Пераможцы спаборніцтваў будуць названы 28 кастрычніка.

З 18 кастрычніка стартаваў інтэлектуальны анлайн-конкурс **«Папараць-кветка БДУ»,** у якім можа прыняць удзел кожны ахвотнік у адмысловай групе ў сацыяльнай сетцы «УКантакце» – «Online-конкурсы БДУ». Пытанні віктарыны прысвечаны БДУ, яго гісторыі, сучаснаму становішчу, выбітным асобам універсітэта, спартыўным і культурным дзеячам. Частка пытанняў ад рэктарата БДУ, кіраўнікоў падраздзяленняў і студэнцтва публікуюцца ў відэафармаце.

24 кастрычніка ў будынку рэктарата адкрылася **«АРТ-выстава БДУ»,** якая працягнецца 2 тыдні. На выставе будуць прадстаўлены творчыя працы студэнтаў і супрацоўнікаў нашага ўніверсітэта. Працы выкананы ў розных жанрах і тэхніках. Далучайцеся да святкавання Дня народзінаў нашай дзівоснай альма-матар!

Падрыхтавала Дар'я ШУПЕНЬКА

У цэнтры інфармацыйных струменяў

У найстарэйшым класічным універсітэце нашай краіны самым маладым структурным падраздзяленнем з'яўляецца створаны ў 2014 годзе медыяцэнтр – ён выступае ў якасці сувязнога звяна для галоўных інфармацыйна-камунікацыйных струменяў.

Медыяцэнтр складаецца з трох аддзелаў: прэс-службы, унутрыўніверсітэцкіх камунікацый, вэб-праектаў і стратэгічных камунікацый. Ён аб'яднаў такія каналы распаўсюджання інфармацыі, як навіны на сайце ўніверсітэта, комплексная праца з вядучымі рэспубліканскімі СМІ, фарміраванне супольнасцяў у сацыяльных сетках, выданне карпарацыйнай газеты, вядзенне фотаархіва і стварэнне відэаматэрыялаў.

Цэнтральным звяном інфармацыйна-камунікацыйнага медыйнага комплексу БДУ з'яўляецца сайт універсітэта – ***www.bsu.by*** – самы буйны ўніверсітэцкі інфармацыйны рэсурс у нашай краіне, агульная колькасць наведнікаў сайта складае больш за 100 000 у месяц, а агульны лік старонак сайта перавышае 20 000. Сёлета сайт БДУ атрымаў 1 месца ў намінацыі «Адукацыя і навука» інтэрнэт-прэміі TIBO. Летась такую ж узнагароду атрымаў сайт «Абітурыент БДУ», створаны адмыслова для абітурыентаў і іх бацькоў.

Уваходзіць у медыйны комплекс БДУ і газета «Універсітэт», якая выдаецца ў БДУ з 1929 года і з'яўляецца адным з самых старых друкаваных СМІ, якія цяпер выходзяць у краіне. На сайце газеты «Універсітэт» *www.gazeta.bsu.by* размяшчаюцца не толькі самі артыкулы, але дадатковыя матэрыялы, фотарэпартажы і відэасюжэты. У адрозненне ад навін на сайце БДУ, артыкулы ў электронным варыянце газеты могуць каментавацца.

Важным элементам адзінага інфармацыйнага комплексу ўніверсітэта з'яўляецца стварэнне ўмоў для двухбаковай камунікацыі з асноўнымі мэтавымі аўдыторыямі: студэнтамі, абітурыентамі, супрацоўнікамі. Істотную ролю ў забеспячэнні гэтага працэсу іграюць афіцыйныя групы ўніверсітэта ў сацыяльных сетках. У наш час БДУ на афіцыйным узроўні прадстаўлены ў наступных сацыяльных сетках і сэрвісах: група БДУ ў сацыяльнай сетцы «УКантакце» (больш за 23 тыс. падпісантаў), старонкі БДУ ў Facebook (на рускай і асобна на англійскай мове, больш за 4 тыс. падпісантаў), відэаканал БДУ на сайце YouTube (каля 250 000 праглядаў), старонка БДУ ў сэрвісе мікраблогаў Twitter (каля 3 000 чытачоў), старонка БДУ ў прафесійнай сетцы LinkedIn (больш за 23 000 выпускнікоў), старонка БДУ ў сацыяльнай сетцы Google+ (каля 200 тыс. праглядаў), старонка БДУ ў Instagram (сэрвіс абмену фатаграфіямі, больш за 1 тыс. падпісантаў), старонка БДУ ў навуковай сетцы ResearchGate (аўтаматычнае генераванне, каля 1 тыс. удзельнікаў).

Павел САЛАЎЁЎ,
начальнік Медыяцэнтра БДУ

Вучымся кіраваць

Студэнтам дапамагаюць рэалізаваць сябе шматлікія ўплывовыя моладзевыя арганізацыі

Якім чынам ажыццяўляецца падтрымка актыўных студэнтаў, расказвае начальнік упраўлення выхаваўчай работы з моладдзю Аляксей БАГАМАЗАЎ:

Сёння УВРМ з'яўляецца ўнікальнай пляцоўкай для ўвасаблення моладзевых ініцыятыў і праектаў, самарэалізацыі і развіцця асобы студэнта. Упраўленне з поўным правам можа ганарыцца эфектыўнай сістэмай студэнцкага самакіравання, якая ўключае ў сябе Студэнцкую асамблею БДУ, пярвічную арганізацыю БРСМ БДУ, пярвічную прафсаюзную арганізацыю студэнтаў, ГА «Студэнцкі саюз БДУ», студэнцкі савет па якасці адукацыі, савет старастаў, савет зямляцтваў і інш.

Мы садзейнічаем арганізацыі яркіх і насычаных незабыўнымі момантамі міжнародных студэнцкіх форумаў «Святло Вялікай Перамогі», «Зімовая школа студэнцкай журналістыкі» і «Я – валанцёр БДУ». Выязныя навучальныя семінары для студэнцкага актыву «Ты – староста», «Студэнцкі лідар: жыццё навідавоку», «Твой выбар», «Стань найлепшым!» і многія іншыя далі пуцёўку ў жыццё ўжо некалькім пакаленням паспяховых студэнцкіх лідараў.

У дадзены момант УВРМ праводзіць конкурсы «Студэнт года БДУ», «Найлепшы выпускнік БДУ», «Найлепшая студэнцкая газета»; асвятляе студэнцкае жыццё ў інтэрнэт-прасторы і сацыяльных сетках; аказвае адрасную сацыяльную дапамогу і падтрымку моладзі; рэалізуе студэнцкія ініцыятывы і праекты ў рамках конкурсу «Найлепшы моладзевы праект». Больш за 20 студэнцкіх праектаў, пададзеных на конкурс, ужо сталі традыцыйнымі і рэалізуюцца пры фінансавай падтрымцы ўніверсітэта. Сярод іх: грамадска-адукацыйная акцыя «Універсітэт – твой крок у будучыню», творчыя конкурсы «Капуснік БДУ», «БДУ ў тваім фармаце» і «Фотавеламарафон», валанцёрскія праекты «Казкі з дзяцінства» і «Сувязь пакаленняў» і інш.

Упраўленне выхаваўчай работы з моладдзю рухаецца ў нагу з часам і, застаючыся на адной хвалі са студэнтамі, з аптымізмам глядзіць у будучыню.

Вольга ЛОКЦЕВА,
старшыня прафкама студэнтаў БДУ

Разам з БДУ сёлета святкуе 95-гадовы юбілей і прафсаюз адукацыі і навукі. Пярвічная прафсаюзная арганізацыя студэнтаў БДУ – найстарэйшая і самая шматлікая грамадская арганізацыя ва ўніверсітэце і асноўны сацыяльны партнёр, які абараняе сацыяльна-эканамічныя правы і інтарэсы навучэнцаў.

Асноўная дзейнасць студэнцкага прафкама – юрыдычна-прававая падтрымка, кансультацыі па сацыяльна-прававых пытаннях; студэнцкае прадстаўніцтва ў перамовах з кіраўніцтвам ВНУ па арганізацыі адукацыйнага працэсу і пазанавучальнай дзейнасці; грамадскі кантроль умоў вучобы і побыту, арганізацыі харчавання і медыцынскага абслугоўвання; рашэнне жыллёва-бытавых пытанняў; прафсаюзнае навучанне; арганізацыя адпачынку і аздараўлення, другаснай занятасці; падтрымка асобных сацыяльных катэгорый; аказанне матэрыяльнай дапамогі, правядзенне розных мерапрыемстваў і акцый.

Мы ствараем умовы для сацыяльнай падтрымкі студэнтаў, іх прафесійнай і творчай рэалізацыі, а таксама цэласную сістэму інфармацыйных рэсурсаў шляхам развіцця рознабаковых моладзевых ініцыятыў, ідэй і праектаў.

Прафсаюз студэнтаў БДУ аб'ядноўвае самых актыўных, адукаваных, таленавітых і творчых студэнтаў, якія заўсёды дапамогуць вырашыць мноства пытанняў, разнастайна прадставіць студэнцкае жыццё і рэалізаваць свае здольнасці. «Мы з кожным – мы з табой!»

Яўген ХАРУК, в. а. старшыні Студэнцкай асамблеі БДУ



Студэнцкая асамблея БДУ – вышэйшы орган студэнцкага самакіравання ва ўніверсітэце. Сябры Студэнцкай асамблеі робяць усё магчымае для таго, каб развіваць Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт і студэнцкае жыццё ў ім. Мы займаемся дыялогам паміж студэнтамі і кіраўніцтвам універсітэта; вырашаем пытанні па якасці адукацыі, а таксама прадстаўляем студэнтаў БДУ ў міжнароднай моладзевай прасторы.

Асабіста я лічу, што Студэнцкая асамблея – гэта самыя патрыёты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, якія гатовыя ў любы момант дапамагчы ўніверсітэту і стаць на яго абарону. А так як у шырокім сэнсе Студэнцкая асамблея – гэта ўсе студэнты, якія з'яўляюцца сябрамі арганізацый БДУ, то ўсе гатовыя працаваць дзеля будучыні БДУ!

Ад імя Студэнцкай асамблеі віншую ўніверсітэт з 95-годдзем і жадаю росквіту, развіцця, заставацца вечна маладым!

Канстанцін АНДРУСЕВІЧ, БРСМ БДУ

Мы імкнёмся штогод спрабаваць нешта новае, але разам з тым маем нязменныя аўтарскія праекты. Гэта:

· Фестываль студэнцкага жыцця БДУ «Першакурснік FEST».

· Камандны конкурс «Кубак першакурсніка БДУ» .

· Грамадска-асветніцкая акцыя «Універсітэт – твой крок у будучыню», якая праходзіць па школах краіны. Студэнты праводзяць з вучнямі майстар-класы і круглыя сталы, дапамагаюць вызначыцца з будучай прафесіяй.

· Студэнцкі турыстычны злёт «Высокі бераг» заклікае студэнтаў да творчых конкурсаў і спартыўных мерапрыемстваў.

· Грамадска-адукацыйны форум «Стань найлепшым» – конкурс на найлепшую пярвічную арганізацыю праводзіцца сярод усіх факультэтаў БДУ. Адбываюцца майстар-класы і шматлікія інтэлектуальныя гульні, прэс-канферэнцыі, дзелавыя сустрэчы.

· Flashrase – гэта мікс спартыўных выпрабаванняў, якія перамяжаюцца заданнямі на веданне ўніверсітэта.

Акрамя таго, БРСМ БДУ ўдзельнічае ў форумах, грамадскіх акцыях па ахове прыроды, дапамагае ветэранам, наведвае прытулкі і дамы малюткі. Тут пануе атмасфера сапраўднага студэнцкага сяброўства і ўзаемадапамогі, якая застаецца ў памяці надоўга.

БРСМ БДУ | Твой час, твая магчымасць!

Раман КУНЦЭВІЧ, Студэнцкі саюз БДУ

Студэнцкі саюз БДУ – гэта каманда творчых і ініцыятыўных студэнтаў, якім не абыякава, што іх атачае і дзе яны вучацца. На працягу 20 гадоў мы рэалізуем розныя моладзевыя праекты і праграмы, удзельнічаем у арганізацыі агульнаўніверсітэцкага і факультэцкага вольнага часу, праводзім студэнцкія вечарыны, святы, асвятляем жыццё ўніверсітэта. Тут можна рэалізаваць свой патэнцыял, а таксама праводзіць у жыццё свае ідэі, атрымаць унікальны жыццёвы вопыт, правесці час весела і з карысцю! А яшчэ ў кожнага студэнта ёсць унікальная магчымасць стварыць свой праект, а мы абавязкова дапаможам увасобіць яго ў жыццё!

Студэнцкі саюз БДУ супрацоўнічае з ВНУ краін СНД і блізкага замежжа, прадстаўляе наш універсітэт на міжнародных мерапрыемствах і сам з задавальненнем сустракае гасцей.

Ганна ГАМОРЫНА, каардынацыйны савет студэнцкіх інтэрнатаў

Каардынацыйны савет – гэта агульная сям'я студэнтаў з розных краін і гарадоў. 8 студсаветаў робяць жыццё ў інтэрнатах яскравым і запамінальным: культурныя мерапрыемствы і спартыўныя спаборніцтвы, арыгінальныя акцыі і незабыўныя сюрпрызы – усё, каб больш як 8 тысяч жыхароў БДУ не сумавалі.

Інтэрнат – другі дом, які мы робім утульным і бяспечным разам са службай бяспекі. Дапамагаюць студэнцкім саветам творчая лабараторыя і спартыўна-турысцкі клуб, якія выпрацоўваюць натхненне і драйв у рэжыме «нон-стоп», а таксама грамадска-інфармацыйная служба, што захоўвае кожнае кранальнае імгненне гісторыі агульнага дома БДУ. Хочацца пажадаць, каб такіх імгненняў было як мага больш. Новых дасягненняў і плёну табе, БДУ!

Ксенія ВАЛНІСТАЯ, савет старастаў

У студэнтаў ёсць асобы, якія гатовы дапамагчы ў розных сітуацыях – старасты. Напэўна, ніхто не зможа зразумець усю важнасць і адказнасць, якую нясе староста перад групай, толькі староста іншай групы:) Наша арганізацыя складаецца з 750 старастаў, якія кожны навучальны дзень з'яўляюцца мастком паміж студэнтамі і дэканатам. За 17 гадоў існавання арганізацыі праз яе прайшлі тысячы людзей, якія дапамагалі рабіць навучанне больш камфортным, скарыстоўваючы пры гэтым навыкі канфлікталогіі, менеджменту, зносін і ўсталявання міжасобасных кантактаў. Штогод Дзень роднай мовы збірае ў Інстытуце журналістыкі шмат людзей, якія любяць беларускую мову. Дзень старасты, які праходзіць 20 лютага, дазваляе ўзнагародзіць самых актыўных падзякамі за працу. Жадаем БДУ квітнець і дасягаць новых вяршыняў. Са святам!

Яна ДЫБА, студэнцкі савет па якасці адукацыі

Савет па якасці адукацыі спрыяе павышэнню якасці адукацыі ва ўніверсітэце, павышэнню культуры ўзаемаадносін удзельнікаў адукацыйнага працэсу, выкананню акадэмічных свабод і абавязкаў, развіццю прынцыпаў самакіравання. Сёння ССЯА – гэта моцная каманда мэтанакіраваных хлопцаў і дзяўчат з вялікімі задумкамі і планамі, якім не абыякавы лёс нашага ўніверсітэта. Савет займаецца маніторынгам, выяўленнем і рашэннем праблем, якія ўзнікаюць падчас навучання, праводзіць адукацыйныя трэнінгі і семінары, навукова-папулярныя канферэнцыі. За 13 гадоў існавання арганізацыі праведзена велізарная колькасць апытанняў і анкетаванняў, круглых сталоў, заняткаў са студэнтамі. І ўсё гэта для таго, каб наш універсітэт станавіўся лепшым, бо няма мяжы дасканаласці! «Створаны студэнтамі для студэнтаў» – вось наш дэвіз.

Шчасце, калі ўсе здаровыя

Як вядома, поспеху без здароўя не бывае. Адным з прыярытэтных напрамкаў універсітэта было і застаецца развіццё здаровай асобы. Пра дасягненні студэнтаў распавёў загадчык кафедры фізвыхавання і спорту **Віктар КАЛЯДА**.

– Віктар Антонавіч, у чым сутнасць дзейнасці кафедры ФВіС у БДУ, і якая яе матэрыяльна-тэхнічная база?

– У нас чатыры асноўныя задачы. Па-першае, гэта арганізацыя вучэбна-выхаваўчага працэсу. Па-другое, масавае ўцягванне студэнтаў і супрацоўнікаў ВНУ ў сістэматычныя заняткі спортам. Па-трэцяе, правядзенне ўніверсітэцкіх спартакіяд з удзелам вядомых спартсменаў. І, па-чацвёртае, падрыхтоўка студэнтаў да ўдзелу ў міжнародных спаборніцтвах.

Спартыўная база ўніверсітэта раскінута па ўсім Мінску. У яе ўваходзяць 2 спартыўныя комплексы: УСК «Універсітэцкі» і «Буравеснік», крытых спартыўных зал – 27, з іх 7 памяшканняў з'яўляюцца прыстасаванымі для заняткаў фізічнай культурай і спортам; адкрытыя зоны – стадыён, 4 бегавыя дарожкі, 2 спартыўныя пляцоўкі.

– А якое месца займае наша ВНУ сярод іншых універсітэтаў?

– У Беларусі 12 універсітэтаў фізічнай падрыхтоўкі, і, трэба аддаць належнае, БДУ ў гразь не пляснецца. Наша альма-матар не мае профільнага навучання фізічнай падрыхтоўкі, тым не менш мы не апускаемся ніжэй за чацвёртае месца сярод іншых універсітэтаў краіны. Каля 50 студэнтаў уключаны ў склад нацыянальных камand. Што характэрна, ні адзін міжнародны форум не праходзіць без удзелу нашых студэнтаў. Двум спартсменам у мінулым годзе прысвоілі ганаровае званне заслужаных майстроў спорту. Гэта найвышэйшы ўзровень, якога можа дасягнуць спартсмен.

– У чым наша моц, і якімі поспехамі студэнтаў можам ганарыцца?

Зборныя каманды ўніверсітэта паспяхова выступаюць у спаборніцтвах Рэспубліканскай універсіяды, традыцыйна займаючы прызавыя месцы ў лыжных гонках і біятлоне, каратэ і барацьбе, спартыўным арыентаванні, гіравым спорце, спартыўнай аэробіцы і шахматах. У 2015 годзе жаночая зборная каманда БДУ па футзале ўпершыню заняла 1 месца, абгуляўшы ўніверсітэт фізкультуры.

Сёння БДУ мае 8 медалёў паралімпійскага і алімпійскага характару. З іх 7 узнагарод заваяваў Ігар Бокі, а адну Джавід Гамзатаў, які прывёз бронзавы медаль з алімпійскага Рыа-дэ-Жанэйра.

У 2015/2016 навучальным годзе студэнтамі БДУ на міжнародным узроўні, спаборніцтвах кубка і чэмпіянатаў свету, Еўропы, заваявана 24 медалі, з іх 13 залатых, 7 сярэбраных і 4 бронзавыя. На Сусветнай універсіядзе студэнт эканамічнага факультэта Яўген Цуркін заваяваў залаты, сярэбраны і бронзавы медалі ў плаванні. Студэнтка юрфака Алена Амялюсік перамагла ў групавой гонцы чэмпіянату свету па веласпорце, а Віктар Сасуноўскі заваяваў сярэбраны медаль чэмпіянату свету. Іосіф Чугашвілі заваяваў бронзавы медаль чэмпіянату Еўропы па грэка-рымскай барацьбе.

– Наколькі мне вядома, на базе БДУ дзейнічае некалькі прафесійных камand. Як адбываецца ўзаемадзеянне з імі?

– На дадзены момант існуюць 2 прафесійныя каманды па футболе (жаночая і мужчынская). Акрамя таго, нашы каманды па валейболе, баскетболе і гандболе выступаюць у гарадскіх і рэспубліканскіх спаборніцтвах. Для удзелу ў прафесійных турнірах патрэбны значныя фінансавыя выдаткі. Таму дапамагаем, чым можам.

– Як уплываюць праслаўленыя спартсмены і трэнеры на звычайных студэнтаў?

– Унікальны выпадак, што столькі знакамітых спартсменаў сабрана ў адным месцы. Уявіце сабе: у нашым універсітэце працуюць трэнерамі алімпійскі чэмпіён па грэка-рымскай барацьбе Камандар Маджыдаў, заслужаны трэнер Беларусі Мікалай Прусаў, заслужаны майстар спорту Сяргей Шундзікаў. І гэта толькі верх айсберга. Дзе яшчэ такое можна знайсці? Яны напрамую ўплываюць на вынікі. Сваім падыходам прыводзяць людзей у спорт, рыхтуюць спецыялістаў, якія потым працуюць у вышэйшай школе.

– Што Вы хацелі б пажадаць роднаму ўніверсітэту на 95-годдзе?

– Я заўсёды кажу: давайце пажадаем шчасця нашаму дому. А БДУ – дом для тысяч студэнтаў, шчасце ў доме, калі ўсе здаровыя. І я рады, што кафедра фізічнага выхавання і спорту мае да гэтага непасрэднае дачыненне.

Гутарыў
Аляксандр ЖЫБУЛЬ

Традыцыі. Пошук. Эксперымент

Упраўленне па справах культуры БДУ – своеасаблівы асяродак, дзе кожны можа знайсці прымяненне сваёй творчай энергіі і таленту. Пра шматлікія мерапрыемствы і самадзейнасць нам падрабязна распавёў начальнік упраўлення **Уладзімір МАКАРЭВІЧ**.

– Уладзімір Міхайлавіч, некаторыя вашы творчыя калектывы часта гастралююць не толькі па Беларусі, але і за мяжой. Гэта і «Крыжачок», і капэла. Якія падзеі Вы ўзгадаеце за апошні год?

– Кожны год багаты на падзеі. Увесну шматлікія творчыя калектывы БДУ прынялі ўдзел у рэспубліканскім фэсце творчасці «АРТ-Вакацыі». Усяго нашымі калектывамі і студэнтамі ўніверсітэта было заваявана 27 дыпломаў, што дазволіла БДУ стаць уладальнікам гран-пры фэсту і ў чарговы раз пацвердзіць статус вядучай ВНУ краіны.

Улетку з вялікім поспехам прайшлі канцэрты заслужанага аматарскага калектыву Беларусі ансамбля танца «Крыжачок» БДУ на міжнародных фальклорных фэстах у Босніі і ў Германіі, канцэрты народнай харавой капэлы БДУ – на міжнародным харавым фэсце ў Францыі.

Акрамя паспяховага ўдзелу ў конкурсах і фэстах знакавымі падзеямі сталі юбілеі вядучых творчых калектываў БДУ. У 2015 годзе 70 гадоў справіў ансамбль танца «Крыжачок»: гэты юбілей быў адзначаны грандыёзным канцэртам пры ўдзеле «ветэранаў» ансамбля ў вялікай зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі. А ў 2016 годзе 70 гадоў спаўняецца народнаму аркестру народных інструментаў, народнаму драматычнаму тэатру «На балконе» і народнай харавой капэле.

– «Віват, студэнт», «Фэст эстрады», адкрытая ліга КВЗ БДУ, рок-фэст «Такія пернікі» – сталі візітоўкамі ўніверсітэта. Якія задумкі ўвасобіліся ў жыццё сёлета?

– У лютым гэтага года ў абноўленым фармаце прайшоў фэст інтэлектуальных гульняў «Студэнцкія гульні БДУ». Яго ўдзельнікамі сталі больш за 300 студэнтаў з БДУ і іншых ВНУ Беларусі.

У маі адбыўся І форум творчай моладзі БДУ. У яго рамках прайшлі канцэрты творчых калектываў і індывідуальных выканаўцаў БДУ, арт-кросы, майстар-класы па вакале, харэаграфіі, арганізацыі і вядзенні мерапрыемстваў, а таксама канферэнцыя з удзелам рэктара БДУ Сяргея Абламейкі, міністра адукацыі Беларусі Міхаіла Жураўкова і міністра культуры Беларусі Барыса Святлова.

Вынікам форуму творчай моладзі стала стварэнне творчага саюза Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, які ўжо прадставіў сваю працу на шоу-праграме «Віват, студэнт БДУ!» і рыхтуе канцэртную праграму да 95-годдзя alma mater. Мы ўпэўнены, што гэта арганізацыя яшчэ заявіць пра сябе і як мае быць паслужыць БДУ.

– Упраўленне па справах культуры праводзіць і фэсты міжнароднага маштабу. Ці зменяць яны свой фармат?

– Кожны год у праграмах міжнародных фэстаў «Тэатральны куфар БДУ» і «Папараць-кветка БДУ» адбываюцца тыя ці іншыя змены. Так, напрыклад, акрамя паказу спектакляў студэнцкіх і моладзевых тэатраў з розных краін свету, «Куфар» ужо ўключае праекты: «Дыскусійны клуб фэсту», Koufar-in-motion, «ДрамаЛаб». Галоўная навіна «Куфра» ў 2016 годзе – удзел у фэсце дзіцячых тэатраў. Такое новаўвядзенне невыпадковае. Па-першае, практычна штогод у праграме фэсту з'яўляліся тэатры, удзельнікамі якіх былі ў тым ліку дзеці. Па-другое, тут ёсць і выхаваўчы момант. Сёння, як нам здаецца, страчана сувязь пакаленняў, і тэатральнаму выхаванню дзяцей надаецца не так шмат увагі. Мы ж хацелі б аднавіць гэта першае важнае звяно ў ланцужку тэатральнага гледача, аматара – прынамсі, у нашым фэсце. Мы спадзяёмся, што гэты эксперымент будзе мець поспех.

– Як Вы ацэньваеце творчы патэнцыял нашых студэнтаў?

– Студэнты БДУ самыя таленавітыя, што даказваюць іх шматлікія ўзнагароды. Творчы патэнцыял нашай моладзі бязмежны, але ён патрабуе пастаяннай падтрымкі, якую яны ў любы час могуць атрымаць ад нас – упраўлення па справах культуры. І мы рады, што кожны год да нас прыходзяць новыя зусім розныя, але вельмі таленавітыя студэнты.

– Як адбываецца ўліванне таленавітых студэнтаў у культурнае жыццё ўніверсітэта?

– Па-першае, у пачатку навучальнага года ўсе нашы творчыя калектывы праводзяць кастынгі і тым самым папаўняюць свае шэрагі. Трапляючы ў калектыў, студэнты далучаюцца да культурнага жыцця ўніверсітэта настолькі максімальна, наколькі гэта магчыма. Дарэчы, як правіла, такія адборы ў калектывы вельмі папулярныя. Напрыклад, сёлета на кастынг у народны музычна-драматычны тэатр «На філфаку» прыйшло каля 100 чалавек!

Па-другое, новыя імёны нашых талентаў становяцца вядомымі дзякуючы шматлікім мерапрыемствам і конкурсам, у якіх яны ўдзельнічаюць. І адным з самых буйных мерапрыемстваў, дзе запальваюцца новыя зоркі БДУ, з'яўляецца фэст эстрады! На працягу шматлікіх гадоў ён нязменна прыцягвае ўвагу самых таленавітых студэнтаў. Многія вядомыя цяпер у БДУ вакалісты, танцоры і вядучыя прайшлі праз фэст эстрады: Дзмітрый Нікановіч, Антон Мартынаў, Павел Кіслы, Валянціна Паўлава, Улад Макарэвіч, Лідзія Заблоцкая, танцавальны калектыў Freaks IBMT і многія іншыя!

– Што пажадаеце альма-матар да 95-годдзя БДУ?

– Роднаму ўніверсітэту, які мы бязмерна любім і паважаем, жадаем росквіту і дасягнення новых вяршыняў, а таксама, вядома, самых разумных і таленавітых студэнтаў!

Гутарыла
Марына ДЗЕНІСЕВІЧ

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

25 кастрычніка 2016 года
Падпісана да друку 21.10.2016 г.
Зак. 582. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ»
ЛП № 02330/117 ад 14.04.2014.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by